ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР.

№ 101 (1220) | Субота, 21 снежня 1957 года | Цана 40 кап.

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ

Аб Пленуме Цэнтральнага Камітэта Комуністычнай партыі Совецкага Саюза

16—17 снежня 1957 года адбыўся Пленум Цэнтральнага Камітэта Комуністычнай партыі Совецкага Саюза.

Пленум ЦК абмеркаваў наступныя пытанні:

1. Аб выніках Нарад прадстаўнікоў комуністычных і рабочых партый (дакладчык т. Суслаў М. А.)

2. Аб рабоце прафесіянальных саюзаў СССР (дакладчык т. Грышын В. В.)

Па разгледжаных пытаннях Пленум прыняў адпаведныя пастановы.

Пленум ЦК выбраў т. Мухітдзінава Н. А. членам Прэзідыума ЦК КПСС.

Пленум выбраў сакратарамі ЦК КПСС тт. Ігнатава Н. Г., Кірычэнку А. І. і Мухітдзінава Н. А.

ДЗЕВЯТАЯ СЕСІЯ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР

У Маскве, у Вялікім Крэмлёўскім палацы, 19 снежня пачала работу дзевятая сесія Вярхоўнага Совета СССР чацвёртага склікання. Над купалам Палаца ўзнят чырвоны Дзяржаўны флаг Саюза Совецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

У 10 гадзін раніцы адкрылася сесія Совета Нацыянальнасцей. Старшынствуе Старшыня Совета Нацыянальнасцей дэпутат В. Т. Лаціс. У 13 гадзін адбылася сесія Совета Саюза, на якой старшынствуе Старшыня Совета Саюза дэпутат П. П. Лабанаў.

У зале пасяджэнняў, акрамя дэпутатаў, знаходзіліся шматлікія госці, члены дыпламатычнага корпуса, совецкія і замежныя журналісты.

На пасяджэннях палат прысутнічалі цёпла сустрэтыя дэпутатамі і гасцямі таварышы Л. І. Брэжнеў, Н. А. Булганін, К. Е. Варашылаў, Н. Г. Ігнатаў, Ф. Р. Казлоў, А. І. Мікаян, Н. А. Мухітдзінаў, М. А. Суслаў, Е. А. Фурцэва, Н. С. Хрушчоў, Н. М. Швернік, П. Н. Паспелаў, Д. С. Каротчэнка, Я. Э. Калнберзін, А. П. Кірыленка, А. Н. Касыгін, М. Г. Первухін.

На сесіі Совета Нацыянальнасцей з дакладам выступіў Старшыня Мандатнай камісіі Совета Нацыянальнасцей дэпутат І. Д. Назарэнка. Ён паведаміў, што 25 жніўня 1957 года ў Совет Нацыянальнасцей па Бакінскай-Дзержынскай выбарчай акрузе № 153 замест выбыўшага дэпутата быў выбран І. І. Кузьмін.

Заслухаўшы даклад Мандатнай камісіі, Совет Нацыянальнасцей аднагалосна прызнае поўнамоцтвы нававыбранага дэпутата.

На сесіі Совета Саюза з дакладам аб поўнамоцтвах нававыбраных дэпутатаў у Совет Саюза выступіў Старшыня Мандатнай камісіі Совета Саюза дэпутат І. Д. Мустафаеў. Ён паведаміў, што ў перыяд паміж восьмай і дзевятай сесіямі адбыліся выбары ў Совет Саюза замест выбыўшых дэпутатаў па двух выбарчых округах. Па Бучацкай выбарчай акрузе № 522 дэпутатам выбран Т. С. Тепліцкі, па Гомельскай гарадской выбарчай акрузе № 560—Ф. А. Сурганаў.

Совет Саюза аднадушна прызнаў поўнамоцтвы нававыбраных дэпутатаў.

На пасяджэннях Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей зацверджан парадак дня сесіі і парадак яе работы. Будуць разгледжаны наступныя пытанні:

1. Аб Дзяржаўным плане развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1958 год.
2. Аб Дзяржаўным бюджэце СССР на 1958 год і аб выкананні Дзяржаўнага бюджэту СССР за 1956 год.
3. Зацвярджэнне Указаў Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР.

* * *

У 16 гадзін адкрылася сумеснае пасяджэнне Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей. У залі раздаюцца бурныя апладысменты, калі ў прэзідыуме паяўляюцца таварышы Н. І. Беляеў, Л. І. Брэжнеў, Н. А. Булганін, К. Е. Варашылаў, Н. Г. Ігнатаў, Ф. Р. Казлоў, А. І. Мікаян, Н. А. Мухітдзінаў, М. А. Суслаў, Е. А. Фурцэва, Н. С. Хрушчоў, Н. М. Швернік, П. Н. Паспелаў, Д. С. Каротчэнка, Я. Э. Калнберзін, А. П. Кірыленка, А. Н. Касыгін, К. Т. Мазураў, В. П. Мжаванадзе, М. Г. Первухін.

Адкрываючы сумеснае пасяджэнне Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей, дэпутат В. Т. Лаціс паведамляе, што на пасяджэнні прысутнічае ўрадавая дэлегацыя Сірыйскай Рэспублікі на чале з намеснікам старшыні Совета міністраў Сірыі Халедам эль-Аземам. Ад імя дэпутатаў ён вітае паважаных гасцей. У залі раздаюцца гарачыя апладысменты ў гонар дэлегацыі Сірыйскай Рэспублікі.

Старшынствуючы дае слова для даклада аб Дзяржаўным плане развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1958 год намесніку Старшыні Совета Міністраў СССР, Старшыні Дзяржплана СССР дэпутату І. І. Кузьміну.

Затым з дакладам аб Дзяржаўным бюджэце СССР на 1958 год і аб выкананні Дзяржаўнага бюджэту СССР за 1956 год выступіў Міністр фінансаў СССР дэпутат А. Г. Зверэў.

Старшынствуючы дэпутат В. Т. Лаціс паведамляе, што ад групы дэпутатаў Вярхоўнага Совета СССР паступіла запытанне Ураду Совецкага Саюза, у якім гаворыцца:

Група дэпутатаў Вярхоўнага Совета СССР звярнула ўвагу на тое, што, мяркуючы па друку, у заходніх краінах, якія ўваходзяць у Поўночнаатлантычны саюз, працягваюцца спробы распальваць «халодную вайну». Гэта ў сваю чаргу вядзе да ўзмацнення гонкі ўзбраенняў, аб чым сведчыць і заява дзяржаўных дзеячоў некаторых з гэтых краін.

Дэпутаты звяртаюцца да Совецкага ўрада з просьбай інфармаваць—у якім становішчы знаходзіцца абмеркаванне паміж дзяржавамі пытанняў аб раззбраенні.

Запытанне падпісалі дэпутаты: А. Бакулеў, П. Быкаў, С. Камалаў, М. Ібрагімаў, М. Мацерыкова, В. Грышын, Н. Пузанчыкаў, Н. Тіханаў, П. Тычына.

В. Т. Лаціс паведаміў дэпутатам, што іх запытанне перададзена ў Совет Міністраў СССР і адказ на яго будзе дадзен у ходзе сесіі.

На гэтым сумеснае пасяджэнне Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССР заканчваецца.

20 снежня сесія працягвала сваю работу. (ТАСС).

Хроніка культурнага жыцця

Бярозаўская сельская бібліятэка Хоцімскага раёна, дзе працуе загадчыцай Аксення Анжанка, праводзіць змястоўную культурна-масавую работу. Тут наладжваюцца калектыўныя чытанні мастацкай літаратуры, канферэнцыі чытачоў і іншыя мерапрыемствы. За апошні час бібліятэка правяла канферэнцыі па кнігах «Успаміны сваякоў аб Леніне», «Такім можа стаць кожны калгас» К. Арлоўскага.

Ул. УЛАСЕНКА.

Ваўкавыскае раённае аддзяленне таварыства па распаўсюджванню палітычных і навуковых ведаў за апошнія адзінаццаць месяцаў арганізавала больш за паўтары тысячы лекцый. Былі прачытаны лекцыі: «Што дала Гродзеншчыне Совецкая ўлада», «Беларусь за 40 год», «В. І. Ленін—правадыр і арганізатар Кастрычніцкай рэвалюцыі», «Барацьба працоўных Гродзеншчыны за Совецкую ўладу».

І. ЮШЧАНКА.

Магілёўскае абласное ўпраўленне культуры і абласная бібліятэка імя В. І. Леніна правялі двухдзённы семінар загадчыкаў раённых і гарадскіх бібліятэк. Прысутныя праслухалі рад лекцый і кансультацый па тэорыі бібліятэчнай справы і прапагандзе літаратуры, у тым ліку на тэмы: «Работа з краязнаўчай літаратурай у раённых і гарадскіх бібліятэках», «Выкарыстанне новых метадычных і бібліяграфічных дапаможнікаў», «Прапаганда беларускай літаратуры ў бібліятэках Магілёўскай вобласці», бібліяграфічны агляд літаратуры на тэму: «Што чытаць аб Магілёве і Магілёўскай вобласці». Удзельнікі семінара абмеркавалі вопыт работы Касцюкоўскай сельскай бібліятэкі Гомельскай вобласці, Клічаўскай і Крычаўскай раённых бібліятэк.

В. АРЦЕМ'ЕЎ.

У вёсцы Вялікае Сяло Дзержынскага раёна стаіць на ўзгорку прыгожы вялікі драўляны дом. Гэта клуб калгаса «Усход». У ім размешчаны бібліятэка і глядзельная зала больш чым на 100 месц. Гэта адзін са шматлікіх клубаў, якія былі сёлета пабудаваны калгасамі. Такія клубы ўзведзены ў сельскагаспадарчых арцелях «Звязда», «Непераможны сцяг», імя Кірава.

Ул. КУКСА.

Мастацтва жыццёвай праўды

Думкі аб Усесаюзнай выстаўцы

Перш чым пачаць гаворку пра Усесаюзную мастацкую выстаўку, я павінен папярэдзіць чытача, што не лічу сябе дастаткова кампетэнтным, каб прэтэндаваць на ўсебаковую ацэнку шматлікіх твораў жывапісу і скульптуры, прадстаўленых на выстаўцы. Ды гэта і немагчыма зрабіць у невялікім газетным артыкуле. Я проста хацеў-бы падзяліцца некаторымі непасрэднымі назіраннямі і ўражаннямі, сваімі меркаваннямі аб творах, якія па розных прычынах больш чым іншыя спадабаліся, закранулі думку або ўсхвалявалі мяне. Паколькі ўсе мы маем прыхільнасць да твораў рэалістычных, якія захоўваюць жыццёвую даставернасць у тыпажы, у псіхалагічным стане, у колеры, у кампазіцыі, дык я і буду гаварыць іменна аб такіх творах. Пры гэтым павінен падкрэсліць, што Усесаюзная мастацкая выстаўка ў цэлым — яркая дэманстрацыя новых дасягненняў мастацтва сацыялістычнага рэалізма, мастацтва, якое адлюстроўвае жыццё і барацьбу совецкіх людзей у мінулым і сённяшнім шматгранна, у рознастайных праявах як у грамадзянскіх ідэалах, так і ў інтымнай эмацыянальнай сферы.

Калі ўваходзіш у былы будынак манежу, дзе разгорнута выстаўка жывапісу і скульптуры, адразу ўзнікае думка: «Якая вялікая колькасць работ тут прадстаўлена!» Велізарны зал экспазіцыйнымі шчытамі падзелен на тры доўгія і шырокія калідоры, якія ў сваю чаргу дзеляцца як-бы на асобныя пакоі, і ўсюды, на ўсіх сценах—карціны і карціны, усцяж сцен ці пасярод залаў—рознастайныя скульптуры. Тут сабрана ўсё лепшае, што створана мастакамі і скульптарамі Совецкага Саюза да 40-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.

Кожная рэспубліка мае на выстаўцы свае экспазіцыйныя залы. У такім прынцыпе экспазіцыі выяўлена ідэя братняй садружнасці народаў Совецкай краіны. Апрача таго гэта зручна з пункту погляду практычнага агляду. Наведвальнік выстаўкі адразу заўважае нацыянальныя і тэматычныя асаблівасці і дасягненні выяўленчага мастацтва той ці іншай рэспублікі.

Паколькі мне па неабходнасці прыдзецца гаварыць аб выбраных творах выстаўкі, я буду разглядаць іх не па рэспубліках, а па тэматычных комплексах і жанравых групах.

Сярод тэматычных кампазіцый, блізка звязаных з юбілейнай датай, звяртаюць на сябе ўвагу вялікае палатно ўкраінскага мастака Л. А. Шмацько «Выступленне В. І. Леніна аб плане ГОЭЛРО» і чатыры параўнаўча невялікія работы В. А. Серова «У Смольным», «Чакаюць сігналу», «Дэкрэт аб зямлі» і «Дэкрэт аб міры». Карціна Шмацько не вызначаецца арыгінальнасцю кампазіцыі. Прыблізна такіх карцін з выступленнямі В. І. Леніна мы ўжо бачылі нямала. Але карціна вызначаецца каляровасцю, маляўнічасцю, вельмі грунтоўнай распрацоўкай тыпажу і ўменнем даць адчуць прастору. Глыбіня залы, дзе адбываецца выступленне В. І. Леніна, настолькі адчуваецца, што хочацца ў яе ўвайсці. Вельмі пераканаўчы і вобраз В. І. Леніна ў паставе трыбуна, прамоўцы.

На здымку: карціна У. Джапарыдзе «Пажаданне на дарогу».

Работы В. А. Серова вельмі змястоўныя. Гэтага аўтару ўдалося дабіцца вялікай увагай да чалавечай індывідуальнасці. Кожны вобраз у яго творах мае свой псіхалагічны стан, тыпалагічныя рысы і разам з тым сваю непаўторную індывідуальнасць.

На карціне «У Смольным» у цэнтры яе В. І. Ленін. У адрозненне ад многіх работ, прадстаўленых на выстаўцы, Сероў паказвае Леніна не ў паставе трыбуна, а ў паставе мудрага субяседніка. На хаду ён штосьці гаворыць абступіўшым яго салдатам і чырвонагвардзейцам. Такая кампазіцыя дапамагла падкрэсліць жывую сувязь правадыра з рэвалюцыйнымі масамі. Правадыр тут не ў нейкай меры над масамі, а разам з імі, ён плоць і кроў саміх мас. Гэтая ідэя карціны добра чытаецца. Карціна «Чакаюць сігналу» пераносіць нас на ўзбярэжную Нявы ў ноч перад штурмам. Каля гранітнага парапета чырвонагвардзейцы і салдаты насцярожана чакаюць сігналу. На пярэднім плане, побач з кулямётам-«максімам», салдат, чырвонагвардзеец і жанчына. Кожны вобраз на карціне мае індывідуальную характарыстыку. Асабліва шматгранна выпісаны вобразы на карціне «Дэкрэт аб зямлі». На якога селяніна тут ні глянеш, ён жыве сваім жыццём, сваім настроем. Сяляне ўзрадаваны дэкрэтам, але кожны з іх радуецца адпаведна са сваім характарам, а часткова і ўзростам. У карціне «Дэкрэт аб міры» над усім пануе радасць. І гэта вельмі зразумела кожнаму, хто сам быў на вайне і дажыў да яе канца. У гэтай радасці вострае адчуванне, што цяжкое акопнае жыццё, раны, смерць таварышаў—усё гэта мінулася. Мы бачым не саладжавую, а суровую радасць франтавікоў, якім абрыдла ваяваць за чужыя ім мэты. Стаіш перад карцінай і думаеш: «Гэта сапраўдныя салдаты імперыялістычнай вайны». Нават здаецца, што на цябе павявае вецер гісторыі.

Нямала добрых карцін на выстаўцы прысвечана падзеям з жыцця XIX стагоддзя або больш позняга дарэвалюцыйнага мінулага. Гэта карціна армянскага мастака С. М.Мурадзяна «Апошняя ноч». Сюжэт яе такі: каля піяніна сядзіць музыкант у чырвоным халаце. Ён азірнуўся на рыпенне дзвярэй, у якія ўваходзяць туркі. У вачах у музыканта смяротная туга, але трымаецца ён з годнасцю. Псіхалагічны стан асуджанага, шчыльная чырвоная гама ў халаце, дываны на падлозе і тахце ствараюць злавесна-прыгнятаючую атмасферу. Адчуваецца, што тут зараз будзе зроблена злачынства.

Цікавая карціна беларускага мастака А. С. Гугеля «З мінулага». У будане, крыху падобным на буданы, у якіх ехалі бежанцы часоў першай імперыялістычнай вайны або ездзілі па дарогах Беларусі балаголы, едуць трое: ссыльная рэвалюцыянерка, канваір і возчык. Вельмі добра ахарактарызаваны твар ссыльнай. Ён мярцвяна-белы, задумліва-строгі. Канваір наадварот выглядае чырвонашчокім здаравякам. Яго вобраз кантрастуе з вобразам ссыльнай. Адразу відаць, што ён належыць да лагеру сытых, задаволеных. Але ніякай утыроўкі ў яго вобразе няма. Некалькі стомлены выгляд у возчыка. На твары ў яго паглыблены ў сябе роздум. Магчыма, ён спачувае рэвалюцыянерцы. Будан, гразкая дарога, уся каляровая гама карціны ладзены так, што адчуваецца час, у які адбываецца падзея.

Сюды-ж трэба аднесці і карціну В. І. Іванова «Пасля пакарання Александра Ульянава».

З вялікай сілай раскрыта ў карціне Ю. Н. Туліна «Лена» жалоба сем'яў рабочых залатых прыскаў па расстраляных царскімі катамі ў 1912 годзе кармільцах-забастоўшчыках. Мастак паказвае момант паніхіды па забітых. На тварах у родных і блізкіх, што натоўпам сабраліся каля труны ахвяр, мы бачым і гора, і роспач, і абурэнне, і гнеўны пратэст. Паставы людзей па-народнаму простыя, жыццёва-пераканальныя. Умелае выкарыстанне змрочных фарбаў падкрэслівае трагізм сітуацыі.

Тэма стойкасці совецкіх людзей у самых цяжкіх абставінах, іх непахіснасці ў адданасці партыі і Радзіме натхняла мастакоў Н. Н. Чэбакова ў карціне «Маладагвардзейцы», В. Ф. Задарожнага ў карціне «Яны неўміручыя», М. І. Малюціна і Е. А. Грыбава ў карціне «Па заданню партыі».

На першай з іх на шэрым фоне фашысцкага засценку перад намі група маладагвардзейцаў. У іх постацях, выразах твараў мастак не імкнуўся падкрэсліць гераізм. Ён не трактуе гэтых совецкіх хлопцаў і дзяўчат як выключных, рамантычных герояў. Яны для яго ў многім радавыя людзі, якія маюць амаль зусім звычайны бытавы выгляд. Але за знешняй мяккасцю, звычайнасцю мы адчуваем і непахіснасць, бачым поўныя пераканання ў сваёй правільнасці позіркі. Мы з павагай і спачуваннем глядзім на гэтых звычайных і разам з тым выдатных прадстаўнікоў совецкай моладзі, як-бы чытаем іх нялёгкія і невясёлыя думы.

Інакш напісана карціна ўкраінскага мастака В. Ф. Задарожнага «Яны неўміручыя». Па зместу яна як-бы працяг папярэдняй. Маладагвардзейцаў фашысты ўначы вывелі на кару ў снежнае поле. Трактоўка тэмы тут рамантычная. Паставы ў юнакоў і дзяўчат падкрэслена гераічныя, позіркі таксама. Твары ў большасці зацятыя, гордыя, таму нават профілі добра чытаюцца з псіхалагічнага пункту погляду. Карціна напісана ў халоднай гаме. Гэта ўзмацняе адчуванне, што героі хутка загінуць.

Адлюстраванню гераічнай партызанскай барацьбы беларускага народа супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў прысвечана карціна беларускага мастака Я. А. Зайцава «Канстанцін Заслонаў». На карціне паказан выхад партызан з акружэння. На ўзлессе выйшла вялікая група партызан і, згуртаваўшыся вакол Заслонава, чакае загаду, куды ісці далей. Карціна добра скампанавана, у рэалістычнай манеры распрацоўвае тыпаж, добра напісан беларускі лес. Вобраз Заслонава не зусім удаўся мастаку.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

Меркаванні чытачоў

Выкарыстанне энергіі малых рэк

Амаль у кожным раёне нашай рэспублікі ёсць рэкі. Аднак гідраэнергетычнае выкарыстанне іх яшчэ недастатковае. У сучасны момант у Беларусі ёсць толькі каля 90 малых гідрастанцый. Да гэтага часу велізарныя запасы гідраэнергетычных рэсурсаў, размешчаных у самай непасрэднай блізкасці ад масавага спажыўца—калгасаў, МТС, соўгасаў, застаюцца амаль некранутымі.

У рэспубліцы электрыфікавана толькі каля 17 працэнтаў калгасаў. Асноўная прычына павольнага асваення рэк рэспублікі—недаацэнка гэтай вялікай народнагаспадарчай справы. Сярод нейкай часткі гідраэнергетыкаў існуе шкодная думка аб нямэтазгоднасці пабудовы малых гідраэлектрастанцый як неэканамічных. Многія кіраўнікі калгасаў, МТС і соўгасаў больш схільныя да будаўніцтва цеплавых станцый, якія працуюць на вадкім і цвёрдым паліве. Між тым агульнавядома, што ГЭС маюць шмат пераваг перад цеплавымі станцыямі: эканомія паліва, вышэйшы каэфіцыент карыснага выкарыстання гідраэнергарэсурсаў, прастата электрыфікацыі вытворчага працэсу, невялікая колькасць абслугоўваючага персаналу, вышэйшая прадукцыйнасць працы.

Нягледзячы на гэта, паасобныя гідратэхнікі адмоўна ставяцца да выкарыстання энергіі малых рэк. Не пярэчачы супраць пераваг раённых станцый у параўнанні з дробнымі, трэба адзначыць, што яшчэ доўга значныя прасторы БССР будуць пазбаўлены буйных станцый. Таму для падняцця прадукцыйных сіл такіх раёнаў мэтазгодна, на нашу думку, пабудова дробных сельскіх гідрастанцый.

Усяго ў Беларусі больш трох тысяч рэк і ручаёў, у тым ліку 880 рэк даўжынёй больш 15 кілометраў. Каля ста рэк маюць значную магутнасць, роўную рабоце 300 тысяч конскіх сіл у год.

Асобныя вобласці і раёны Беларусі дамагліся і дамагаюцца значных поспехаў у выкарыстанні малых рэк. У Гродзенскай вобласці пабудова гідраэлектрастанцый стала масавай з'явай. Не адстаюць і асобныя раёны Мінскай вобласці. Напрыклад, у Лагойскім раёне калгасы «Іскра», імя Калініна, «Першае мая» даўно выкарыстоўваюць энергію маленькай рэчкі Гайны для патрэб гаспадаркі. Тут пабудавана некалькі ГЭС. Кошт аднаго кіловата энергіі, якую атрымлівае станцыя на гэтай рацэ, абыходзіцца ў 19 капеек. У выніку калгасы эканомяць у год па 15—17 тысяч рублёў. Гэта вялікі выйгрыш. Пры дапамозе электраэнергіі мелюць збожжа, нарыхтоўваюць сечку і выконваюць многія іншыя працаёмкія работы. Шырокія магчымасці адкрываюцца перад калгасамі Стаўбцоўскага раёна. Раён зрэзаны рэкамі, вялікімі і малымі. Восем рэк і рэчак упадаюць у Нёман, сем прытокаў мае рака Сула.

Вялікую работу па выкарыстанню гідраэнергіі малых рэк ажыццяўляюць і калгасы Маладзечанскай вобласці. Тут, недалёка ад мястэчка Солы, на рацэ Ашмянцы, вядуцца работы па збудаванню Рачунскай ГЭС. Новая гідрастанцыя дасць ток сельгасарцелям імя Кірава, імя Сталіна, імя Багушэвіча і пяці калгасам Смаргонскага і Астравецкага раёнаў.

Да вайны на рэках размяшчалася многа млыноў з наліўнымі коламі. За перыяд Айчыннай вайны ад многіх з іх засталіся толькі фундаменты ды масты. Але гэтыя гідразбудаванні пры гаспадарчым выкарыстанні маглі-б адыграць важную ролю пры пабудове новых электрастанцый. У раёнах шмат майстроў, ініцыятыўных людзей, многія з якіх пакуль не прыцягнуты да вырашэння гэтай важнай праблемы.

Будаўніцтва электрастанцый ад 500 да 6.000 кіловат, як устаноўлена практыкай,—найбольш мэтазгоднае. Такія станцыі найбольш эканамічна выгадныя. Яны могуць абслужыць дзесяткі калгасаў і раёнаў і здольныя акупіць затраты за некалькі год. Напрыклад, калгас «Іскра» Лагойскага раёна пабудаваў у 1948 г. гідраэлектрастанцыю. З 1948 па 1956 г. яна дала калгасу чыстага даходу 154 тысячы рублёў.

Неабходна, каб развіццё будаўніцтва сельскіх электрастанцый ішло перш за ўсё па лініі максімальнага выкарыстання воднай энергіі малых рэк. Патрэбна пабудову некалькіх станцый на адной рацэ дакладна планаваць, каб пазбегнуць такіх памылак, калі адна электрастанцыя мае лішак вады, а другой яе не хапае.

Будаваць малыя гідрастанцыі павінны не толькі калгасы, соўгасы, МТС. Добра было-б, каб у гэтай справе прымалі ўдзел прамысловыя прадпрыемствы буйных гарадоў—Мінска, Віцебска, Гомеля, Магілёва і іншых. Прадпрыемствы Мінска, напрыклад, могуць падрыхтаваць кадры калгаснікаў для работы на электрастанцыях, забяспечыць станцыі гідратурбінамі, трансфарматарамі, кабелем, ізалятарамі і г. д.

У электрыфікацыі калгасных вёсак актыўны ўдзел павінны прыняць студэнцтва і навучэнцы школ працоўных рэзерваў. Чаму-б не пераняць карысны вопыт Свердлоўскай, Чэлябінскай, Горкаўскай і іншых абласцей, дзе ў будаўніцтве малых гідрастанцый прымаюць удзел заводы?

Пабудова гідраэлектрастанцый на малых рэках у далейшым выкліча іх аб'еднанне ў мясцовыя сельскія энергетычныя сістэмы. Гэта дасць магчымасць размяркоўваць больш роўнамерна і рацыянальна запасы электраэнергіі для патрэб народнай гаспадаркі.

Як будзе ажыццяўляцца аб'еднанне гідраэлектрастанцый, паказвае прыклад будаўніцтва каскаду сельскіх ГЭС на рацэ Дрысвяты. Тут, па праекце, складзёным Беларускім філіялам Гіпрасельэлектра ў 1948—1950 гг., было прадугледжана раку Дрысвяты, якая знаходзіцца на стыку трох братніх рэспублік—Беларусі, Літвы і Латвіі, асвоіць у тры прыёмы і злучыць адзінай высокавольтнай лініяй. Была складзена схема яе энергетычнага выкарыстання. Першая станцыя «Дружба народаў» паміж азёрамі Дрысвяты і Аболе пабудавана ў ліпені 1953 г. Ажыццяўляецца будаўніцтва другой гідрастанцыі «Шлях да комунізма» ля населенага пункта Хвасты, у 16 кілометрах ад першай. Яна будзе забяспечваць электраэнергіяй 17 калгасаў, дзве МТС і раённы цэнтр Відзы. І трэцяя—у вусці ракі ля населенага пункта Казяны. Лінія высокавольтнай перадачы звяжа гідраэлектрастанцыі «Шлях да комунізма», «Дружба народаў» і Казянскую ГЭС у мясцовую энергетычную сістэму. Лінія перадач Дрысвяцкага каскаду злучыцца ў адну агульную сетку з пабудовай раённай станцыі.

Мільёны рублёў эканоміі атрымлівалі-б калгасы, соўгасы, МТС ад выкарыстання дармавой сілы нашых рэк. А як значна вырасла-б прадукцыйнасць працы!

Якая вялікая выгада выкарыстання электраэнергіі, відаць са шматлікіх прыкладаў. Пры абмалоце хлеба, водазабеспячэнні, электрадойцы, электрычнай стрыжцы, прыгатаванні кармоў, распілоўцы лесу затраты працы зніжаюцца ў два—тры разы, а гадзінная прадукцыйнасць кожнага агрэгата павышаецца на 28—30 працэнтаў. Бязвежавая аўтаматычная вадакачка з электрапрыводам павялічвае прадукцыйнасць працы ў параўнанні з ручной падачай больш чым у 166 разоў. Падлічана, што бесперабойнае водазабеспячэнне станоўча адбіваецца на прадуктыўнасці дойнага статку. Напрыклад, удой адной каровы пашываецца на 10—15 працэнтаў.

Кожная тысяча кіловат-гадзін электраэнергіі, выдаткаванай на патрэбы сельскагаспадарчай вытворчасці, эканоміць 300 чалавекадзён і сто конедзён.

Электрыфікацыя калгасаў далучае дзесяткі тысяч калгаснікаў да культуры і актыўнага палітычнага жыцця. Яна рашуча ўплывае на ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы сельскагаспадарчай вытворчасці.

Энергія малых рэк чакае свайго выкарыстання. Яна павінна стаць важным рычагом развіцця сельскагаспадарчай вытворчасці Беларускай ССР.

Г. НІКІЦІН,
кандыдат геаграфічных навук.

У Кобрынскім музеі

За апошні час фонды кобрынскага музея імя Суворава папоўніліся вялікай колькасцю новых экспанатаў, якія сабраны на месцы і паступілі з іншых музеяў. Побач з рэчамі археалогіі і нумізматыкі, знойдзенымі на тэрыторыі горада і раёна, ёсць вельмі рэдкія здымкі старога Кобрына, фотаздымкі аб дзейнасці партызан у тутэйшых месцах у перыяд Вялікай Айчыннай вайны. Знойдзены фотакопіі архіўных дакументаў аб рэвалюцыйных падзеях на Кобрыншчыне ў перыяд першай рускай рэвалюцыі 1905—1907 гадоў, а таксама аб дзейнасці Кобрынскага павятовага рэўкома ў 1920 годзе.

Львоўскім дзяржаўным гістарычным музеем перададзены Кобрыну партрэты гістарычных дзеячоў XVI—XVIII стагоддзяў, рэчы сярэдневяковай абарончай зброі, манеты XV—XVII стагоддзяў і інш.

Ленінградскі музей А. В. Суворава прыслаў нашаму музею старажытную зброю, скульптуры, копіі рускіх сцягоў XVIII стагоддзя і рознастайныя выяўленчыя работы. Па заказу музея фоталабараторыяй «Ленфотохудожник» зроблены шматлікія фотакопіі з дакументаў, гравюр і малюнкаў, якія экспануюцца ў Ленінградскім музеі А. В. Суворава, што таксама ўвойдуць у пашыраную і ўзноўленую кампазіцыю музея.

А. МАРТЫНАЎ,
дырэктар кобрынскага музея імя А. В. Суворава.

Цікавая сустрэча

Днямі з піонерамі 20-й чыгуначнай школы Мінска сустрэліся работнікі дзіцячых часопісаў «Бярозка» і «Вясёлка». У госці да школьнікаў прыйшлі пісьменнікі Ус. Краўчанка, С. Грахоўскі, П. Рунец і А. Вольскі.

Рэдактар часопіса «Бярозка» Ус. Краўчанка расказаў аб плане работы на 1958 год. У будучым годзе ў часопісе ўводзіцца новы раздзел «Будзьце ветлівымі», у якім будуць змяшчацца гутаркі аб паводзінах дзяцей дома, у гасцях, на вуліцы, у тэатры і іншых грамадскіх месцах. Па просьбе чытачоў рэдакцыя перыядычна будзе змяшчаць матэрыялы ў дапамогу калектывам мастацкай самадзейнасці.

Піонеркі Ала Гоман, Наташа Чарнова, Іра Даўжанская і іншыя выказалі рад цікавых заўваг і пажаданняў. Яны прасілі, каб на старонках часопіса «Бярозка» больш змяшчалася матэрыялаў аб цікавых піонерскіх справах, аб піонерах-героях Вялікай Айчыннай вайны, больш друкавалася пісем вучняў.

І. БАЧЫЛА.

Пяць год працуе кіномеханікам у Акцябрскім раёне Зіна Трухан. З месяца ў месяц яна перавыконвае план паказу кінакарцін, заўсёды вялікую ўвагу ўдзяляе дэманстрацыі сельскагаспадарчых фільмаў.

На здымку: кіномеханік Зіна Трухан за работай.

Заслужаны поспех

Выдатным поспехам карыстаецца ў совецкага народа спектакль К. Трэнёва «Любоў Яравая», які ідзе на сцэне ўжо больш 30 год.

Грамадскасць гарадскога пасёлка Ганцавічы прагледзела прэм'еру спектакля «Любоў Яравая» ў выкананні драматычнага калектыву мясцовага Дома культуры.

Калектыву ўдалося ўвасобіць гераічную старонку барацьбы за Вялікі Кастрычнік. Пастаноўка спектакля ажыццёўлена пад кіраўніцтвам заслужанага настаўніка БССР, пенсіянера—В. Арлова. Спектакль быў падарункам саракагоддзю Вялікага Кастрычніка.

Поспеху спектакля садзейнічалі не толькі выканаўцы, але і мастакі Шымкевіч і Задзяркоўскі, касцюмер Шавель, рэжысёр Агранаўская і інш.

Галоўную ролю Яравой выконвала Таіса Травулька, якая добра ўвасобіла вобраз. Паспяхова справіліся са сваімі ролямі Дубянецкі, Яромін, Кісялевіч, Арлоў і інш.

Значную дапамогу ў пастаноўцы спектакля аказаў драматычнаму калектыву метадыст тав. Высоцкі.

Спектакль будзе паказаны ў перадавых калгасах раёна. Драматычны калектыў рыхтуе новыя спектаклі па п'есах нашых совецкіх драматургаў.

І. САВІЦКІ.

Ганцавічы

Спектакль «Грозны год» (тэатр імя Янкі Купалы) адзначаны журы Усесаюзнага фестывалю драматычных тэатраў дыпломам першай ступені.

На здымку: сцэна са спектакля. У ролі В. І. Леніна—артыст **П. Малчанаў**, у ролі Дзержынскага—артыст **К. Сянкевіч**.

ЭНТУЗІЯСТЫ КУЛЬТУРНАЙ РАБОТЫ

У глыбі Палесся

Поўным ходам ідзе будаўніцтва Васілевіцкай дзяржаўнай раённай электрастанцыі. Месца ля вёскі Шацілкі, куды прыехалі тры гады назад першыя інжынеры-геадэзісты і першыя атрады будаўнікоў, стала цяпер непазнавальным: на пустыры вырас добраўпарадкаваны гарадскі пасёлак будаўнікоў Васілевіцкай ДРЭС.

Няхай нават яшчэ відаць некаторыя недаробкі, але пасёлак існуе! Такія двухпавярховыя мураваныя дамы ў Шацілках пабудаваны ўпершыню. Ёсць свая прыгожая трохпавярховая сярэдняя школа, працуе бальнічны гарадок. Арганізавана рабочае забеспячэнне. Пабудавана хлебапякарня. Ёсць дзіцячыя яслі і сад, але яны ўжо не задавальняюць растучых запатрабаванняў будаўнікоў. Хутка будуць адкрыты новыя дзіцячыя ўстановы. Будаўнікі рэгулярна глядзяць новыя кінокарціны і карыстаюцца паслугамі двух бібліятэк.

Акрамя сельскай бібліятэкі, якая знаходзіцца на тэрыторыі будоўлі, будаўнічы камітэт адкрыў нядаўна прафсаюзную бібліятэку, дзе працуе загадчыцай Марыя Трацэўская. Цяпер тут амаль тысяча чытачоў. А кніжны фонд абедзвюх бібліятэк даходзіць ужо да дванаццаці тысяч экземпляраў.

Сярод прачытаных будаўнікамі і ўсім насельніцтвам пасёлка і вёскі кніг — творы Маркса, Энгельса, Леніна, Мічурына, Тімірязева, работы Вільямса і Лысенкі, творы класікаў мастацкай літаратуры, кнігі, якія асвятляюць вопыт наватараў вытворчасці, дасягненні нашай перадавой савецкай навукі.

Электраслесар Іван Сямёнаў за апошнія два гады прачытаў больш двухсот кніг. Святлана Дзярабіна працуе матарысткай пасля заканчэння сярэдняй школы. У яе фармуляры запісана 250 кніг.

Калгасніца калгаса імя Дзержынскага Яўгенія Вараб'ёва — актыўны чытач з 1953 г. У апошні час яна прачытала збор твораў А. С. Пушкіна, «У агні» І. Гурскага, «Жарцы» І. Клаза, «Да новага берага» В. Лаціса і многа іншых кніг.

У ліку актыўных чытачоў бібліятэк яшчэ з 1953 г. лічыцца выхавацельніца дзіцячага сада Е. Паспешная, мастаўшчык Л. Круталь, начальнік аддзела працы і зарплаты П. Левертаў, бухгалтар А. Багдан, прараб будаўнічага ўчастка І. Некрашэвіч, тэхнік другога прамысловага ўчастка І. Крупіцкі.

Бібліятэкі ахвотна наведваюць рабочыя і служачыя, калгаснікі, тэхнікі, інжынеры, настаўнікі, а таксама, многа школьнікаў.

Бібліятэкарка і яе памочніцы Раіса Шульман і Анастасія Зялёная не проста абменьваюць кнігі школьнікам. Кожная з іх абавязкова распытае юнага чытача аб героях кнігі, аб яе змесце, выслухае заўвагі аб прачытаным, зробіць вывады, а толькі потым параіць для чытання наступную кнігу. І школьнікі добра ведаюць, што калі ў пасялковай бібліятэцы ўзяў кнігу, дык чытай уважліва і беражы.

Бібліятэка вядзе работу з завочнікамі, якім выпісвае патрэбныя для вучобы кнігі, а таксама арганізоўвае канферэнцыі чытачоў, літаратурна-мастацкія вечары, кніжныя выстаўкі, афармляе стэнды і плакаты.

За апошні час бібліятэкай праведзена пяць канферэнцый чытачоў: «Запаветы Леніна моладзі», абмеркаванне аповесці В. Тэндракова «Не да двара» і інш., літаратурна-мастацкія вечары: «120-годдзе з дня смерці вялікага рускага пісьменніка А. С. Пушкіна», «Вобраз комуніста ў савецкай мастацкай літаратуры» і інш. У мерапрыемствах бібліятэкі прымалі актыўны ўдзел чытачы—маладыя будаўнікі: рознарабочая другога прамысловага ўчастка Н. Барсук, слесар Кананенка, рабочы Мацвееў, настаўніца В. Казлоўская, работніца Г. Гузелевіч, сакратар комсамольскай арганізацыі П. Манькоў і інш.

Старшыні будаўнічага камітэта П. Юфераву варта было-б часцей наладжваць у клубе даклады на розныя палітычныя і навукова-папулярныя тэмы. За 1957 год тут адбыліся толькі дзве лекцыі аб міжнародным становішчы і некалькі лекцый на тэму: «Індустрыялізацыя будаўніцтва электрастанцый шляхам шырокага ўжывання розных жалезабетонных канструкцый», пасля якіх паказваўся фільм аб будаўніцтве Кіраўскай цеплаэлектрацэнтралі.

Камітэт комсамола таксама арганізоўвае вечары моладзі, на якіх праводзяцца гутаркі на розныя тэмы, напрыклад: «Умей жыць у калектыве», «Аб пільнасці савецкіх людзей», «Планы электрыфікацыі нашай краіны ў шостай пяцігодцы».

У залах бібліятэкі добра афармлены стэнды і кніжныя выстаўкі, прысвечаныя 40-годдзю Вялікага Кастрычніка. Многа плакатаў пра творчасць М. Горкага, Н. Остроўскага, А. Гайдара і іншых савецкіх пісьменнікаў. Вылучаецца стэнд «Гэтых дзён не змоўкне слава» — пра рэвалюцыйныя падзеі 1917 года.

У чытальных залах бібліятэкі заўсёды многа свежых газет і часопісаў. Тут можна атрымаць кансультацыю па розных пытаннях.

Н. СМАРАДЗІНСКІ.

Ці так трэба гандляваць кнігай?

(ПІСЬМО У РЭДАКЦЫЮ)

У культмаг Васілішкаўскага райспажыўсаюза зайшла даярка калгаса «Зара» Алена Ачапоўская.

— Дайце мне што-небудзь па перадавому вопыту раздою кароў,—папрасіла яна.

— Нічога ў нас па гэтаму пытанню няма,—абыякава адказала прадаўшчыца тав. Бернадская і пайшла ў другі аддзел.

Продаж кніг тут у асноўным ідзе праз культмаг. У ім ёсць больш трох тысяч назваў кніг. Усе іх выставіць на вітрыны нельга. Для таго, каб чытач выбраў сабе неабходную кнігу, павінен быць каталаг літаратуры, спісы новых кніг. Але нічога гэтага тут няма. На вітрыне няма нават ніводнай кнігі па сельскай гаспадарцы, мала кніг беларускіх пісьменнікаў.

Райспажыўсаюз сістэматычна не выконвае план распаўсюджвання кніг. 70 працэнтаў сродкаў, якія паступаюць ад продажу кніг, ідуць ад рэалізацыі падручнікаў.

У раёне многа сельскіх магазінаў, якія маглі-б дапамагаць у продажы кніг. Аднак яны па сутнасці не займаюцца гэтай работай. У іх няма патрэбнай калгаснікам літаратуры.

А інструктар райспажыўсаюза тав. Ібрагімаў нядаўна наогул спыніў кніжны гандаль у сельскіх магазінах, матывуючы гэта іх непрыстасаванасцю.

Смешныя і сумныя прыклады можна прывесці з практыкі кніжнага гандлю. У Дудкоўскі магазін прыйшоў пчалавод і спытаўся, што ёсць па пчалярству. Яму адказалі: «Адзін толькі «Авадзень»(?!) Прадавец нават не ўяўляў, што гэта мастацкі твор. У большасці выпадкаў загадчыкі магазінаў не ведаюць, якія ў іх ёсць кнігі і не маюць іх спісаў.

Зусім няправільна адносяцца работнікі райспажыўсаюза і да атрымання кніг з базы аблкнігагандлю. Бяруць кнігі, якія трапляюць пад руку, не ўлічваючы таго, што патрабуе чытач, што ўжо ёсць у раёне. Наглядаюцца выпадкі, калі некаторых кніг прывозіцца столькі, што можа хапіць па дзве на кожнага чытача. Яны ляжаць мёртвым грузам на базе, а ў іншых месцах, магчыма, іх не хапае. Таксама размяркоўваюцца яны і ўнутры раёна.

Толькі з-за безадказных адносін работнікаў гандлю прадстаўнікам школ і бібліятэк раёна прыходзіцца ездзіць у Гродна, каб набыць там патрэбную літаратуру. Нядаўна Васілішкаўская сярэдняя школа купіла ў Гродна на тры тысячы рублёў кніг.

Школы раёна таксама маглі-б дапамагчы гандлюючым арганізацыям у продажы кніг. Нажаль, райспажыўсаюз не паклапаціўся стварыць пры кожнай з іх ларкі.

У баку ад гэтага пытання і райком комсамола. У раёне няма кніганош, і ніхто не думае аб іх вылучэнні.

Кніжны гандаль — справа дзяржаўнай важнасці. Яна патрабуе да сябе сур'ёзных адносін і ў першую чаргу ўмення гандляваць.

Н. МАРКАЎ.

Школьнае літаратурнае аб'еднанне

Пры Абчугскай сярэдняй школе Крупскага раёна актыўна працуе літаратурнае аб'еднанне. Літгурткоўцы абмяркоўваюць творчасць пачынаючых аўтараў, творы беларускіх пісьменнікаў. У апошні час у школе праведзены літаратурны вечар, прысвечаны 75-годдзю з дня нараджэння Я. Коласа, канферэнцыя чытачоў «Мае любімыя героі беларускай літаратуры», дыспуты па творах І. Шамякіна «Крыніцы» і «Непаўторная вясна».

Літаб'еднанне два разы ў месяц выпускае літаратурную газету «Наша слова». Нядаўна гурткоўцы выдалі рукапісны альманах «Першыя крокі». У ім змешчаны нарыс І. Шабекі, апавяданні К. Гарміновіч, Л. Гаркуна, В. Шавялёва, Н. Еўпак, Е. Гаманьковай, вершы А. Садоўскага, А. Мясаедава.

І. РАБКОЎ.

Дняпроўскія крыніцы

Колькі размоў было аб абласных альманахах! Яны ўзнікалі і на нарадах маладых празаікаў і паэтаў, і на пасяджэннях прэзідыума Саюза пісьменнікаў БССР. Неабходнасць у такіх выданнях была відавочная і для саміх літаратараў, і для чытачоў. Нарэшце, справа зрушылася з месца. У мінулым годзе выйшаў «Нёман»—зборнік гродзенскіх літаратараў, сёлета, напярэдадні 40-годдзя Кастрычніка, выдадзен альманах маладзечанскіх аўтараў «Нарач». А вось з'явіўся і новы зборнік пісьменнікаў Магілёўшчыны «Дняпро».

«Дняпро»—трэцяя кніга магілёўскіх пісьменнікаў, выдадзеная за пасляваенны час. Першыя дзве кнігі альманаха (1949 і 1950 гг.), якія выходзілі пад назвай «Літаратурны Магілёў», атрымалі станоўчую ацэнку чытачоў і літаратурнай грамадскасці. Адно з самых буйнейшых у рэспубліцы, Магілёўскае літаратурнае аб'еднанне за апошнія гады вырасла колькасна і якасна. Усё гэта давала падставу чакаць, што наступная кніга будзе цікавай і змястоўнай. У многім гэтыя спадзяванні апраўдаліся. Шэраг твораў паказвае, што іх аўтары людзі здольныя і патрабавальныя да сваёй творчасці.

Альманах складаецца з твораў, якія адлюстроўваюць асноўныя этапы гісторыі нашага народа за 40 год, Вялікі Кастрычнік і грамадзянскую вайну, падзеі Вялікай Айчыннай вайны і сённяшнія будні. Такі падбор матэрыялу варта прызнаць вельмі ўдалым.

Старыя большэвікі, удзельнікі Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны выступаюць са сваімі ўспамінамі аб першых днях Савецкай улады, аб вялікім правадыру працоўных В. І. Леніне. Колькі-б твораў мы ні чыталі аб тых незабыўных днях, нас заўсёды будуць хваляваць новыя і новыя падрабязнасці, дэталі, што захавалі ў сваёй памяці непасрэдныя ўдзельнікі падзей. Таму гэтак хвалююць нас успаміны С. І. Анжэнкава «1917 год, Петраград...», Ф. С. Пятровай, якой пашчасцілася асабіста сустракацца з Уладзімірам Ільічом.

Аб удзеле працоўных Магілёўшчыны ў рэвалюцыі і грамадзянскай вайне расказваецца ва ўспамінах старых большэвікоў М. Т. Максімава і П. П. Махоркіна, у артыкуле кандыдата гістарычных навук В. Бандарэнкі «Магілёў у гады грмадзянскай вайны». Пазнавальная, выхаваўчая каштоўнасць падобных матэрыялаў бясспрэчная, і трэба ўсяляк вітаць добрую ініцыятыву рэдкалегіі альманаха.

У альманаху «Дняпро» апублікаваны ўрыўкі з партызанскіх запісак былога члена Магілёўскага падпольнага абкома партыі І. Крыскаўца «Былі тых дзён». Яны прыводзяць да думкі, што наспела неабходнасць напісаць грунтоўную гісторыю партызанскага руху на Беларусі. Подзвіг народных мсціўцаў заслугоўвае гэтага. Сапраўды, І. Крыскавец прыводзіць даныя, якія вялізныя страты былі нанесены ворагу партызанамі Магілёўшчыны за тры гады. А колькі герояў нарадзіла ўсенародная барацьба! Герояў, чые імёны яшчэ невядомы нам.

Вобразы многіх савецкіх патрыётаў паўстаюць з партызанскіх запісак І. Крыскаўца. Ні варожыя блакады, ні правакацыі не зламалі іх баявога духу, непахісную веру ў перамогу. У сакавіку 1942 года партызаны Магілёўшчыны на акупіраванай тэрыторыі ўстанавілі ў Клічаўскім раёне Савецкую ўладу. Фашысты вар'яцелі ад звярынай злосці, але не змаглі паставіць народ на калені. Партызанскія сілы з дня ў дзень раслі. І не толькі савецкія людзі ўліваліся ў рады народных мсціўцаў.

Здаралася, што і некаторыя салдаты гітлераўскай арміі, пераканаўшыся ў хлусні гебельсаўскай прапаганды, пераходзілі да партызан, як зазначае аўтар (раздзел «Немцы і гітлераўцы»).

Прыходзіцца пашкадаваць, што многія мясціны напісаны занадта сцісла, сухой мовай, ад чаго запіскі трацяць у сваёй эмацыянальнасці. Аўтару варта папрацаваць над запіскамі, пашырыць іх, напоўніць новымі фактамі.

Храналагічна да запісак І. Крыскаўца прымыкае ўрывак з аповесці «У змяінай цясніне» Анатолія Іванова. Тут паказаны падзеі таго часу, калі Совецкая Армія граміла на Далёкім Усходзе свайго даўняга ворага — імперыялістычную Японію. Напісаны гэты ўрывак займальна, але ў многім ён непераканальны. Дзеючыя асобы занадта плакатныя, бясколерныя, выяўляюць сваю сутнасць гучнымі тырадамі, а не ўчынкамі. Праўда, аўтар імкнецца кампенсаваць псіхалагічную непераканальнасць герояў неверагоднымі выпадковасцямі, нагрувашчваючы адну прыгоду на другую, у выніку чаго траціцца ўсякае пачуццё праўдападобнасці. Так, ён расказвае, як совецкі лётчык Кавальчук трапіў у палон да японцаў. Яны прапануюць совецкаму лётчыку вялікія грошы, каб ён адцураўся Радзімы. Кавальчук з абурэннем адхіляе прапанову ворага, за што яго бесчалавечна катуюць. У гэты-ж час трапляе ў палон амерыканскі лётчык Гундэрсон. Японцы сустрэлі яго як самага дарагога госця, з усім камфортам. Гундэрсон таксама імкнецца схіліць Кавальчука да здрады. Напружваючы памяць, Кавальчук успамінае, што калісьці сустракаў гэтага чалавека. На Заходнім фронце разам з совецкімі лётчыкамі прымала ўдзел у «чаўночным» палёце група амерыканцаў. Кавальчук ляцеў у адным самалёце з Гундэрсонам над роднай Беларуссю і вось іхні самалёт збілі. Спусціліся на парашутах. Немцы насцігаюць іх, і Кавальчук, не раздумваючы, пацягнуў Гундэрсона ў крайнюю хату. Аказваецца, яны апынуліся ў доме знаёмага Кавальчуку чалавека. Адстрэльваючыся ад немцаў, Кавальчук адначасова распытваў гаспадара хаты аб сваёй сям'і, а Гундэрсон тым часам імкнуўся здацца ў палон па ўсіх «міжнародных правілах». Але Кавальчук не дазваляе яму гэтага зрабіць. Дарэчы, Гундэрсон без цяжкасцей разумее совецкага лётчыка, таму што ведае рускую мову. Калі верыць аўтару, Гундэрсон наогул больш лінгвіст, чым лётчык. Ён аказваецца, кітайскую грамату настолькі адолеў, што добра гаворыць з кітайскім хлопчыкам Лі. Адным словам, усё, як у казцы, таму і паверыць у гэта цяжка. Такія-ж малаверагодныя прыгоды адбываюцца і з іншымі героямі.

Апавяданне П. Шасцерыкова «Лістоўка» таксама трымаецца толькі на інтрыгуючым сюжэце.

З празаічных твораў найбольш выгодна вылучаюцца нарыс М. Караля і В. Тупікава «Сын Тайцзыхэ»—аб кітайскіх практыкантах, якія асвойвалі новую спецыяльнасць на Магілёўскай фабрыцы штучнага шоўку. Сагрэты светлым пачуццём, не пазбаўлены і паэтычных знаходак, нарыс гэты чытаецца з цікавасцю. Праўда, дзеля эфекту аўтары дзе-ні-дзе збіваюцца на штучнасць. Калі кітайскаму студэнту Вану Чжань-юаню прапанавалі паехаць у Магілёў, ён тут-жа пачаў дэкламаваць «Чуден Днепр при тихой погоде», або гэтаму самаму Ван Чжань-юаню трэба было пад'ехаць у Салтанаўку, і яму адразу-ж прыйшло на памяць, што іменна гэта Салтанаўка апісана ў рамане Л. Н. Талстога «Вайна і мір».

Упушчэннем рэдкалегіі трэба лічыць, што ў альманах уключан адзін толькі нарыс на рабочую тэматыку, а калгасная тэматыка наогул выпала з альманаха.

Бадай самым цікавым у альманаху творам з'яўляецца літаратурны кіносцэнарый «Выпрабаванне», напісаны Я. Тарасавым і В. Кудраўцавым. Важнае пытанне станаўлення характару маладога чалавека пастаўлена і вырашана аўтарамі арыгінальна, на шырокім жыццёвым фоне. Тут хоць і прысутнічаюць вытворчыя праблемы, але яны не засланяюць жывых людзей, а, наадварот, служаць выяўленню ўзаемаадносін дзеючых асоб. У творы багата знаходак, якія сведчаць аб добрым веданні аўтарамі спецыфікі жанра. Сцэнарый напісаны весела, з гумарам, без нудных павучанняў і прапісных ісцін. Індывідуальнымі рысамі надзелены Ігар Курыльскі, Жора, Нікіта, Галя, Майя, Сёмачкін, Трафімыч і інш. Удаліся масавыя сцэны. Нажаль, у мове адчуваецца кніжнасць, прыгладжанасць: «Клянусь головой Аполлона», «О чем вы шумите, молодые витязи?», «Вы сегодня прекрасны, как тысяча і одна ночь», «воспарил на вершины Олимпа», «Сладкая поэзия мечты превратилась в горькую прозу жизни», «Час голубой мечты и пения соловьев», «Эта ночь прекрасна. Она звучит, как изумительная симфония». Штучнаю, фальшываю таксама атрымалася сцэна, дзе Сёмачкін пераварочваецца з лодкай. У цэлым-жа кіносцэнарый заслугоўвае, каб ім зацікавіліся работнікі студыі «Беларусьфільм».

У альманаху на гэты раз паэзія прадстаўлена вершамі В. Матэвушава, А. Пысіна. В. Карпечанкі, А. Рабцава, байкай С. Пацёмкіна.

Найбольш шырока прадстаўлены вершы Васіля Матэвушава. З іх варта адзначыць «У лясной цішы», «Чэрвень», «Дождж», «Дуб у Разліве». Астатнія-ж хварэюць на дробязнасць задумы, за што не раз папракалі паэта. Ён часта стараецца прывязаць верш да канцоўкі, хоць яна і не вынікае арганічна са зместу верша. Так, напрыклад, заключныя радкі «Зялёнага семафора» павісаюць у паветры таму, што яны не падрыхтаваны папярэдне:

Зашастала лісцё прысад,
Гамоніць лес шумлівы,
І запрашаюць мяне сад,
І сенажаць, і ніва
Ісці ў абуджаны прастор,
Што лёг да небасхіла:
Вясна зялёны семафор
Маёй зямлі адкрыла.

Разгорнутая метафара ў даным выпадку неадчувальная, бо мы не настроіліся на гэты нечаканы вывад.

Вершы Аляксея Пысіна напісаны з добрым прафесіянальным майстэрствам. Хацелася-б толькі, каб аўтар быў прадстаўлен больш рознабакова.

Радасна, што маладыя паэты спрабуюць свае сілы ў цяжкім, але ўдзячным жанры дзіцячай паэзіі. Вершы «Клён» і «Пчолкі» Васіля Карпечанкі, «Мароз» Алеся Рабцава паказваюць, што іх пошукі ў гэтым напрамку паспяховыя.

Нядрэнную заяўку зрабіў байкай «Певень» С. Пацёмкін. Аўтару ўласціва натуральнасць размовы, лёгкі гумар. Застаецца толькі пажадаць, каб гэты «певень» не застаўся адзінай ластаўкай.

Вершы маладых паэтаў Віктара Даюжэнкі і С. Сямёнава, змешчаныя ў кнізе, не вызначаюцца паэтычнай навізной, слабыя па сваіх мастацкіх якасцях.

З мовай у альманаху таксама справы абстаюць дрэнна. Амаль на кожнай старонцы сустракаешся з фактамі страшэннай неахайнасці. Старонкі страканяць такімі перламі, накшталт «абагрыў крывёю», «дышыць упэўненасцю», «у першых лічбах чэрвеня», «зашчоўкалі выстраламі», «абʼятыя агнём», «труслівыя», «здзеквальныя», «рухаючыйся», «уборку хлябоў», «яны шчупалі нашу абарону», «старык Емельян», «звёздачкі», «чаргамі ППШ», «рота ушла ў брыгаду», «расцвятаў» і г. д.

Ёсць сімвалічны сэнс у тым, што літаратурныя альманахі носяць назвы рэк, азёр. Гэта нібы падкрэслівае, што яны бяруць свой пачатак з глыбінь народа, як рэкі і азёры з глыбінь зямлі.

Няхай-жа яны разліваюцца шырэй і шырэй.

Сцяпан ГАЎРУСЕЎ.

На здымку: карціна **Д. Свешнікава** «Гаспадар тундры».

Мастацтва жыццёвай праўды

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Твар яго пласкаваты, збеднены, малазмястоўны. Над гэтым цэнтральным вобразам карціны мастаку яшчэ варта папрацаваць.

Не пакідае абыякавым наведвальніка выстаўкі карціна Ф. В. Савасцьянава «Салдаты». Тут мы бачым, як салдаты сустракаюць вясну на фронце. У перапынку паміж баямі, магчыма, калі часць адышла на адпачынак, група салдат размясцілася каля кустоў, на палянцы. На кустах толькі-толькі распускаецца лісце. Вясна адчуваецца і ў прыродзе і ў паводзінах салдат. Захацелася трошкі абсушыцца і абагрэцца на сонцы, праяснілася твары: хто ўспомніў пра каханую, хто пра сям'ю. І якая блізкая і зразумелая нам гэтая дума, напрыклад, у выразе твару салдата, што ляжыць на жывоце на зямлі і піша пісьмо. Карціна прасякнута яркім лірычным настроем і ў гэтым яе прыцягальная сіла. У ёй мастак узняў вялікую гуманістычную тэму аб тым, што і на фронце жыццё прадаўжаецца, што і там, у самых цяжкіх умовах, салдаты ўмеюць знаходзіць чалавечыя радасці.

Выклікае роздум і карціна Л. С. Катлярова «На фронт». Яна вяртае нас да гадоў грамадзянскай вайны. Эшалон з салдатамі і матросамі, перакрыжаванымі кулямётнымі лентамі, праходзіць паварот. Гэта дае кампазіцыі экспрэсію. Твары ў людзей засяроджаныя, але не прыгнечаныя, мужна-спакойныя. Гэтыя людзі ведаюць, за што ідуць ваяваць. У карціне выразна выяўлены цэнтр з матросам, які стаіць на поўны рост каля кола гарматы. Настраёвасці карціны дапамагае стан ранняга вечара. Толькі зайшло сонца, неба яшчэ яснае, а ад папяросы ў салдата, што сядзіць пад ствалом гарматы, ужо свеціцца арэол.

Падзеі рэвалюцыйных гадоў, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў знайшлі даволі шырокае адлюстраванне ў працах мастакоў на выстаўцы па зразумелых прычынах. Гэта былі перыяды драматычнага напружання ў жыцці совецкага народа, яркага выяўлення маральных якасцей совецкіх людзей, і натуральна, што яны прыцягвалі ўвагу мастакоў. Але ў жыцці совецкага народа ёсць і іншы, не менш, а можа больш важны бок—напружаная барацьба за пабудову сацыялістычнага і комуністычнага грамадства, рамантыка і пафас стварэння, працоўнага народнага энтузіязму. У адпаведнасці з гэтым на выстаўцы пачэснае месца займаюць і тэмы мірнага жыцця, стваральнай працы, народнага добрабыту. З работ такога характару хацелася-б адзначыць карціну М. І. Ліхачова «Выходны дзень». Яна запамінаецца жывасцю тыпажу і кампазіцыі. Жарты моладзі на вясковай вуліцы ў выходны дзень паказаны вельмі пераканаўча. У мастака назіральнае, відушчае вока. Усё тут—выразы твараў, паставы, вопратка—падпяджана ў жыцці. Карціна прасякнута вясёлым, радасным настроем.

Жыццесцвярджальная па сваёй сутнасці і карціна Д. К. Свешнікава «Гаспадар тундры». Тут мы бачым вобраз чалавека ў поўнай сіле. Гэты вобраз жыхара тундры, што натуральна напоўляюць на нартах, патэтычны і ў добрым сэнсе абагульнены, тыпізаваны. Значная частка постаці чытаецца на фоне неба. У спалучэнні з пісхалагічным станам усведамлення сваёй чалавечай годнасці гэта, мабыць, і надае вобразу манументальнасць і рамантычную прыўзнятасць.

Радуе вока жывая кампазіцыя беларускай мастачкі Р. В. Кудрэвіч «Гарманіст ідзе». Дзяўчаты выйшлі на ганак і са збянтэжана-радаснымі ўсмешкамі пазіруюць усцяж вуліцы, у напрамку адкуль ідзе гарманіст з хлопцамі. Мы адчуваем, што каля хаты зараз будзе вельмі весела.

Тэма калгаснай працы ўвасоблена ў карцінах азербайджанскай мастачкі В. М. Фраловай «Вясновае ворыва», у карціне І. І. Вітман «З начной змены» і ў многіх іншых. Першая з іх успрыймаецца як цікава напісаны пейзаж. На пярэднім плане поле бардовага колеру, над полем воблака, з якога церушыць дождж. Вельмі добра перададзены ў карціне стан пачатку дажджу. У далечы асветленыя сонцам горы. На другой карціне перад намі дзяўчына, якая спіць у полі, каля палаткі. Яна працавала ў начной змене і цяпер адпачывае. Мастаку ўдалося нямногімі сродкамі стварыць прывабны вобраз. Прыгожы твар дзяўчыны і яе постаць не прапісаны падрабязна, але стан сну вельмі добра адчуваецца. Манера занадта абагульненага жывапісу, відаць, не тоіць у сабе вялікіх магчымасцей, але ў дадзеным выпадку яна дала станоўчыя вынікі.

Тэме адпачынку прысвечана карціна грузінскага мастака А. І. Гіголашвілі «На Тбіліскім моры». На ёй мы бачым сямейную сцэну на пляжы, куток жаночага пляжа. Карціна вельмі рэалістычная ў трактоўцы чалавечага цела, моцная па рысунку, але крыху адпастайная ў дачыненні светлаценю. Хацелася-б больш яркіх светлавых кантрастаў, ад гэтага карціна стала-б значна жывейшай, больш аптымістычнай. Яркай нацыянальнай формай вызначаецца карціна другога грузінскага мастака У. М. Джапарыдзе «Пажаданне на дарогу». Тут бацька, выпраўляючы сына ў дарогу, гаворыць яму свае настаўленні. Карціна напісана падрабязна і дакладна, добра скампанавана. Усе тры постаці знаходзяцца на вяршыні ўзгорка і чытаюцца на фоне гор і неба. Мастак праявіў добры густ у выбары тыпажу.

Каўказу прысвечна і карціна аднаго з мастакоў РСФСР П. М. Зарона «Залатая восень». Перад намі чатыры пажылыя жыхары гор, якія сядзяць на вуліцы на лаўцы ў сонечны восеньскі дзень. Адзін з іх чытае газету. Магчыма, што гэта пенсіянеры, якія скончылі сваё працоўнае жыццё. У адрозненне ад аднайменнай карціны Левітана, на дрэвах жоўтага лісця мала. Залатая восень тут больш у людзях, чым у прыродзе. У пейзажы вельмі добра адчуваецца кволае восеньскае сонца.

Неабходна зазначыць, што вельмі прыемна глядзіцца ў зале беларускага жывапісу карціна А. С. Бархаткова «Першая песенька». Яна надзвычай аптымістычная па колеру, у ёй шмат вясны, маладосці—у вобразе маці, што схілілася над малой дачкой, якая ўпершыню іграе на піяніна, у пейзажы за расчыненым акном.

Нельга не ўспомніць і пра карціну беларускага мастака П. С. Крохалева «Арганізацыя калгаса», у якой грунтоўна распрацаваны тыпаж, знойдзена жыццёва-праўдзівая кампазіцыя. Магчыма, што карціна недастаткова яркая ў колеры і таму яна крыху згубілася ў вялікім зале.

Перш чым перайсці да партрэтнага жывапісу, неабходна спыніцца на карціне армянскага мастака Г. С. Ханджана «Анаіт» па матывах армянскай казкі. Гэтая работа ў нейкай меры можа разглядацца як пераходная да партрэта. На карціне мы бачым дзяўчыну, якая занята тканнём дывана. У яе вобразе, у паставе, адзенні адчуваецца казачнасць. Карціна даволі маляўнічая, але галоўным чынам за кошт абставін. Дзяўчына стаіць на ўвесь рост і матае на клубок нітку. У твары яе высокаробнасць, юнацкая непасрэднасць і можа наіўнасць. Вочы напоўаплюшчаны, прыкрыты доўгімі вейкамі. Карціна напісана з добрым густам.

Па-майстэрску напісаны чатыры партрэты І. В. Касміна (партрэты акадэмікаў В. А. Весніна, С. І. Вавілава, жаночы партрэт, партрэт старога з кнігай). Вызначальнай рысай гэтых партрэтаў з'яўляецца тое, што яны напісаны вельмі падрабязна, што ў іх прарысавана кожная жылка і кожная рыса. Але яны не ўспрыймаюцца як натуралістычная фатаграфія, у іх абагульнены псіхалагічны стан, які выяўляе сутнасць партрэта, стварае характар. Партрэты Касміна могуць быць яркім сведчаннем таго, што зусім неабгрунтаванай з'яўляецца боязь некаторых маладых мастакоў па-сапраўднаму вучыцца рысунку, без дасканалага валодання якім немагчыма ствараць высокамастацкія вобразы людзей.

З іншых партрэтных работ высокімі мастацкімі якасцямі вызначаюцца «Нікалай Остроўскі» беларускіх мастакоў А. С. Гугеля і Р. В. Кудрэвіч, «Смуглянка» азербайджанскага мастака А. А. Тагіева, «Медсястра» украінскага мастака М. М. Божыя, «Партрэт дзяўчыны» малдаўскай мастачкі О. Д. Орловай, «Партрэт сына» М. І. Ліхачова, «Комсамолка» В. І. Іванова, «Партрэт жонкі» А. А. Кузняцова. Напісаны яны не ў аднолькавай манеры, але ўсе яны ў аснове рэалістычныя, аб'ядноўвае іх раскрыццё высокародных рыс у характары совецкага чалавека. У іх захапленне чыстатой маладосці, сцвярджэнне сур'ёзных, удумлівых адносін да жыцця. Асабліва ў гэтых адносінах вызначаецца «Медсястра».

Сярод скульптурных партрэтаў пачэснае месца на выстаўцы займаюць работы народнага мастака БССР З. І. Азгура. У скульптуры Ленін з дзяўчынкай мастак са шчырай чалавечай цеплынёй раскрыў у вобразе правадыра бацькоўскія пачуцці, у «Кузьме Чорным» выявіў перш за ўсё думку, уласцівае правобразу ўменне пранікаць у глыбіні жыцця. У асветленым лагоднай і мабыць іранічнай усмешкай вобраза кампазітара М. Аладава адразу ўгадваецца чалавек, усё жыццё якога аддадзена мастацтву. Асабліва моцнае ўражанне робіць «Рабіндранат Тагор». Мастак настолькі падпарадкаваў сабе такі грубы матэрыял, як граніт, што ён як быццам дапамагае выяўленню вобраза. Фактура груба апрацаванага сівога граніту зліваецца з сівізной пісьменніка-мудраца, цёмныя рукі і твар (вынік шліфоўкі) перадаюць паўднёвую асмужанасць індыйца.

З гэтага-ж пункту погляду вельмі цікавая і партрэтная работа эстонскага скульптара Ф. Ю. Саннамээса «Артыст А. Суурорг» (разьба па дрэву). Цікавы ён тым, што аўтар трактуе дрэва як пластычны матэрыял. Такое ўражанне атрымліваецца таму, што паверхня партрэта зроблена гладкай, як быццам адпаліраванай. Гэта з'явілася дадатковым сродкам мастацкага выяўлення, дапамагло стварыць вобраз вельмі інтэлігентнага, з багатым інтэлектам чалавека.

З пейзажаў мне вельмі запомнілася работа Галіны Азгур «Канец сакавіка». Вельмі тонка ў ёй адчула мастачка беларускую прыроду. Не менш тонка раскрыты асаблівасці поўднёвага пейзажу ў карціне ўзбекскага мастака У. Танскыкбаева «Раніца Кайрак-Кумскай ДРЭС». Тут добра перададзена перспектыва нарастаннем смугі ад аднаго плана да другога. Перад намі яр з пясчанымі схіламі, амаль без расліннасці. А глядзіцца карціна вельмі маляўніча, галоўным чынам за кошт смугі.

Выстаўка пакідае вельмі грандыёзнае ўражанне і расказаць аб ёй падрабязна ў невялікім газетным артыкуле, як я ўжо сказаў, проста немагчыма. Бясспрэчна, што яна паказала вялікі рост майстэрства совецкіх мастакоў, у тым ліку і беларускіх. Дасягненні совецкіх мастакоў—гэта раскрыццё творчых магчымасцей сацыялістычнага рэалізма, мастацтва, звязанага з жыццём народа, з яго барацьбой, думамі і спадзяваннямі. Гэта ані не значыць, што можна супакоіцца. Наперадзе шмат работы. Нельга абмежыцца маўчаннем і той факт, што на выстаўцы даволі многа работ недаскананалых, паверхневых або проста недапрацаваных. Гэта адносіцца і да твораў беларускага мастацтва. Гэта абавязвае нашых мастакоў са значна большым пачуццём адказнасці падрыхтавацца да 40-й гадавіны Беларускай ССР.

Янка ШАРАХОЎСКІ.

1807 В. ДУНІН-МАРЦІНКЕВІЧ 1957

Пачынальнік новай беларускай літаратуры

Споўнілася 150 год з дня нараджэння выдатнага беларускага паэта і драматурга, пачынальніка новай беларускай рэалістычнай літаратуры Вікенція Іванавіча Дуніна-Марцінкевіча. Нарадзіўся пісьменнік у 1807 г. надалёка ад Бабруйска, у фальварку Панюшкавічы. Бацька яго быў арандатарам памешчыцкай зямлі. На прыгожых, маляўнічых берагах ракі Беразіны прайшло дзяцінства паэта. У Бабруйску ён атрымаў сярэднюю асвету, а затым некаторы час займаўся на медыцынскім факультэце Пецербургскага універсітэта, але, не скончыўшы яго ў 1827 г. прыязджае на радзіму, пасяляецца ў Мінску, працуе тут перакладчыкам розных папер у духоўнай кансісторыі. Сабраўшы пэўныя сродкі, ён купіў у 1839 г. невялікі маёнтак Люцынку, дзе жыў і працаваў да канца сваіх дзён. Памёр пісьменнік у 1884 г. і пахаваны на могілках у Тупальшчыне каля Люцынкі.

Нягледзячы на тое, што Дунін-Марцінкевіч пачаў пісаць на саракавым годзе свайго жыцця, ён стварыў даволі значную колькасць лірычных, эпічных і драматычных твораў, у якіх імкнуўся ў меру сваіх сіл і таленту рэалістычна паказаць жыццё і побыт беларускага прыгоннага сялянства, норавы памешчыкаў, царскіх чыноўнікаў, панскіх прыслужнікаў.

У той час, калі Дунін-Марцінкевіч выступіў на літаратурную арэну, услед за перадавой рускай, украінскай і польскай літаратурамі, новая беларуская дэмакратычная літаратура ў сваім няспынным развіцці рухалася па шляху да крытычнага рэалізма і народнасці. Арыентуючыся на творчасць перадавых рускіх і польскіх пісьменнікаў, на вусную народную творчасць, Дунін-Марцінкевіч прымкнуў да рэалістычнага напрамку ў беларускай літаратуры. Праўда, трэба падкрэсліць, што рэалізм Дуніна-Марцінкевіча на ўсіх этапах яго творчасці быў абмежаваным і супярэчлівым. Асабліва гэта адносіцца да яго творчасці дарэформеннага перыяду.

З аднаго боку, Дунін-Марцінкевіч як прадстаўнік ліберальнага дваранства прапаведваў ідэі класавага міру паміж памешчыкамі і запрыгоненым сялянствам, імкнуўся згладзіць класавыя супярэчнасці эпохі, прыфарбаваць іх, а з другога боку, у сваіх адносінах да народа, да запрыгоненых сялян, да тых социяльных несправядлівасцей, якія чыніліся памешчыкамі, драпежнікамі-капіталістамі і царскімі судовымі чыноўнікамі — Лятальскімі, Сабковічамі і Кручковымі, ён выступаў абаронцам простага чалавека, прыгоннага селяніна, рэзка крытыкуючы крыўдзіцеляў народа, паноў і падпанкаў-прыгоннікаў, царскіх чыноўнікаў, кулакоў-міраедаў.

Варта падкрэсліць, што вобразы простых людзей, сялян займаюць галоўнае месца ў творчасці Дуніна-Марцінкевіча. На гэтых вобразах мы бачым, што аўтар «Гапона» і «Пінскай шляхты» наследаваў перш за ўсё пушкінскую і гогалеўскую традыцыю рускай класічнай літаратуры. Гэта праявілася ў тым, што беларускі пісьменнік заўсёды імкнуўся паказаць, што і прыгонны мужык — чалавек, падкрэсліваючы ў вобразах сялян іх глыбокую чалавечнасць, высокія інтэлектуальныя здольнасці, іх маральную перавагу над памешчыкамі-прыгоннікамі і асабліва паслугачамі апошніх.

Моцныя элементы крытыцызма ў рэалізме Дуніна-Марцінкевіча праявіліся ў крытыцы і бічаванні сродкамі дасціпнага народнага гумару і сатыры памешчыкаў, якія рабалепствавалі перад чужаземшчынай (Лятальскі), высмейваў прыгоннікаў-аканомаў, выкрываў «кручкатвораў» і хабарнікаў царскага суда (Кручкоў, Пісулькін), міраедаў-кулакоў, драпежнікаў-капіталістаў часоў першапачатковага накаплення (Сабковіч). І тут першы беларускі пісьменнік-рэаліст наследаваў традыцыі рускай і польскай класічнай літаратуры, традыцыі Гогаля, Адама Міцкевіча і Салтыкова-Шчэдрына.

Усё гэта сведчыць, што Дунін-Марцінкевіч ішоў па шляху да крытычнага рэалізма і народнасці. У дарэформенны перыяд творчасці ў камедыях «Пінская шляхта» і «Залёты» заснавальнік беларускай драматургіі цвёрда стаў на вялікі шлях крытычнага рэалізма, але ў сілу класавай абмежаванасці свайго ліберальнага светапогляду не змог належным чынам праявіць сябе, перайсці на пазіцыі рэвалюцыйнай дэмакратыі, стаць асноваположнікам крытычнага рэалізма ў беларускай літаратуры. Заснавальнікамі крытычнага рэалізма ў беларускай літаратуры сталі рэвалюцыйна-дэмакратычныя беларускія пісьменнікі — К. Каліноўскі, Ф. Багушэвіч і А. Гурыновіч.

Крытыкуючы дваранска-ліберальныя погляды Дуніна-Марцінкевіча, Янка Купала выкарыстоўваў лепшыя традыцыі драматургічнай спадчыны заснавальніка камедыйнага жанра ў беларускай літаратуры. Творчае развіццё лепшых мастацкіх традыцый аўтара «Пінскай шляхты» поўкметна ў класічных камедыях Янкі Купалы «Паўлінка» і «Прымакі». Гэтыя камедыі народнага паэта Беларусі ў крытыцы правінцыяльнай шляхты, у сатырычнай характарыстыцы прадстаўнікоў царскай улады, у выкарыстанні вуснай народнай паэзіі, народнай мовы, гумару перакліканцца з камедыямі Дуніна-Марцінкевіча. Не выпадкова Янка Купала ў сваіх аўтабіяграфічных матэрыялах адзначаў, што сярод беларускіх кніг, якія садзейнічалі абуджэнню ў ім жадання пісаць на роднай мове, былі і творы Дуніна-Марцінкевіча.

Гістарычная заслуга Дуніна-Марцінкевіча заключаецца ў тым, што ён пачаў справу зацвярджэння рэалістычнага метаду ў беларускай літаратуры, расчышчаючы шлях да крытычнага рэалізма. Вось чаму яго творчасць мае для нас гістарычна-літаратурнае значэнне, якое даволі трапна вызначана яшчэ Максімам Багдановічам. Аўтар «Вянка» ў 1914 г. пісаў, што Дуніну-Марцінкевічу «нельга адмовіць у веданні беларускай вёскі і ў некаторым маляўнічым таленце, а зрэдку і ў бойкасці пісьма. Найбольш поўна гэтыя вартасці праявіліся ў першай песні паэмы «Гапон», якая захавала і да гэтага часу вядомую цікавасць. Аднак заслугі Марцінкевіча перад беларускай літаратурай ляжаць усё-ж не ў галіне мастацкіх дасягненняў, а ў галіне чыста гістарычнай. Яны ў тым дэмакратызме, які веяў ад сентыментальна-народніцкіх паэм Марцінкевіча, у той гуманізатарскай тэндэнцыі, якая яўна выходзіць з кожнага іх радка, і якая была ў свой час вельмі нялішняй. Нарэшце адзначым, што многа пішучы і многа друкуючы, ён узбуджаў вакол сваіх твораў размовы і палеміку, напамінаючы аб існаванні беларускай мовы і зародкаў беларускай літаратуры, наводзіў на пытанне аб магчымасці іх далейшага існавання».

Значэнне Дуніна-Марцінкевіча ў гісторыі беларускай літаратуры заключаецца яшчэ і ў тым, што ён быў адным з першых беларускіх пісьменнікаў сярэдзіны XIX стагоддзя, якія рашуча абаранялі права свабоднага і самастойнага развіцця беларускай мовы і літаратуры, абвяргаючы тым самым сцвярджэнні польскіх нацыяналістаў, якія адмаўлялі існаванне беларускага народа, яго мовы і лічылі беларусаў польскім племенем, а іх мову толькі гаворкай польскай мовы.

Дунін-Марцінкевіч у меру сваіх сіл і здольнасцей садзейнічаў развіццю новай беларускай літаратуры па шляху да крытычнага рэалізма і народнасці. Ён развіваў беларускую літаратурную мову, узбагачаючы яе новымі словамі, народнымі выразамі і зваротамі, узятымі ім з жывой мовы народа.

Усё гэта разам узятае паказвае, што творчасць Дуніна-Марцінкевіча не страціла свайго значэння і для нашага часу.

М. ЛАРЧАНКА,
прафесар.



Выданні твораў **В. Дуніна-Марцінкевіча**, якія выйшлі ў Пецербургскім выдавецтве «Загляне сонца і ў наша аконца».

На здымку: пераклад першых дзвюх кніг паэмы А. Міцкевіча «Пан Тадэўш», зроблены В. Дуніным-Марцінкевічам (1908), творы пісьменніка «Шчароўскія дажынкі. Купалле» (1910) і «Гапон» (1908), друкаваныя лацінскай на беларускай мове.

Оперны лібрэтыст

Вікенцій Іванавіч Дунін-Марцінкевіч увайшоў у гісторыю нацыянальнай культуры не толькі як пачынальнік новай літаратуры і драматург, але і як выдатны дзеяч, які дапамагаў развіццю музычнага мастацтва Беларусі.

З імем Дуніна-Марцінкевіча звязана стварэнне першых беларускіх опер, іх пастаноўка і нават выкананне вакальных партый. З'яўляючыся стваральнікам музычна-драматычнага гуртка ў Мінску, Дунін-Марцінкевіч напісаў рад оперных лібрэта, музыку да якіх напісаў адзін з членаў гуртка, будучы польскі кампазітар-класік Станіслаў Манюшка. Нажаль, меркаваць аб большасці гэтых твораў у наш час нельга, бо рукапісы іх загінулі і прыходзіцца карыстацца рознастайнымі вельмі лапідарнымі звесткамі. Так, першы біёграф і друг Манюшкі, польскі даследчык Аляксандр Валіцкі ў сваёй манаграфіі (1873) сярод ранніх твораў кампазітара адзначае дзве з яго прапаўшых аперэт (камічных опер) на лібрэта Дуніна-Марцінкевіча: «Рэкруцкі набор» і «Бойка музыкаў». Як вядома з «Мінскіх губернскіх ведамасцей» аднаактовая камічная опера «Рэкруцкі набор» была пастаўлена ў Мінску ў 1841 годзе (прычым, сааўтарам Дуніна-Марцінкевіча лічылі Кржыжаноўскага). У выкананні гэтай оперы ў якасці спевака прымаў удзел і сам аўтар лібрэта. Лёс «Бойка музыкаў» так і застаецца нявысветленым.

У 40-х гадах у Вільні была пастаўлена опера С. Манюшкі «Цудоўная вада» па лібрэта Дуніна-Марцінкевіча. Вядома, што партытура і галасы гэтай оперы выдадзены секцыяй імя Манюшкі Варшаўскага музычнага таварыства. Гэта, безумоўна, павінна зацікавіць музычную і літаратурную грамадскасць.

Шырокую вядомасць атрымаў факт пастаноўкі ў Мінску ў перыяд 1852—1855 гг. оперы Дуніна-Марцінкевіча і Манюшкі «Сялянка» (або як яе называюць у нотаграфіі Манюшкі— «Сельская ідылія»). Рукапіс музыкі да гэтай двухактовай камічнай оперы таксама загінуў, аб чым у 1952 г. паведамляў юбілейны альманах Варшаўскага музычнага таварыства, прысвечаны Манюшку. (Між іншым, совецкі музыказнаўца В. Гарадзінскі адзначае, што музыку гэтай оперы кампазітар часткова выкарыстаў у сваіх творах «Страшны двор» і «Галька»).

Вядома, што лібрэта оперы «Сялянка» засталося, як самастойны твор. Напісанае ў 1843 г., яно з'явілася першым буйным творам аўтара і асобным выданнем было надрукавана ў 1846 г. Гэты твор вельмі папулярны быў на Беларусі.

Лібрэта «Сялянкі» дазваляе меркаваць, што кампазітар шырока выкарыстоўваў беларускія народныя песні і танцы, што сцвярджаецца рознымі звесткамі аб гэтай оперы. Прычым лібрэтыст часам дае нават канкрэтныя ўказанні кампазітару, якія песні трэба выкарыстаць. Так, у канцы першай дзеі оперы Навум заяўляе:

Далей, хлопцы, маладзіцы,
Пачніце ад «Мяцеліцы».

У тым-жа фінале першай дзеі пасля песні Навума даецца рэмарка аўтара: «Змена тону на «Дуду». Гэта значыць, што кампазітару трэба выкарыстаць вельмі папулярную для XIX стагоддзя песню «Дудка-весялуха».

Лібрэта «Сялянкі» сведчыць аб імкненні аўтара да шырокага выкарыстання песенных форм. Гэта адпавядала жанру рускай бытавой оперы з размоўнымі дыялагамі, па ўзору якой яна напісана. Так, нават сама тэма дваранскай «галаманіі» набліжае «Сялянку» да выкрывальна-сатырычнай оперы Пашкевіча «Няшчасце ад карэты» па лібрэта Я. Княжніна (хоць і яе асноўная сітуацыя напамінае «Паненку-сялянку» Пушкіна). Рамансы ў «Сялянцы» спяваюць усе асноўныя дзеючыя асобы оперы — Юлія («О, край мой любы»), Кароль («За леты маладыя»), Ян («У цябе, паненка»). Песні і прыпеўкі характарызуюць Навума («Як пайшоў-жа ж наш каваль», «Я пяцёрку злавіў, ух я!», «Хадзі, дзеўка»). У рознастайных хорах выступае народ («Ужо сонца западае», «Ой, бяда» і інш.).

Народнасць лібрэта «Сялянка» не толькі ў выкарыстанні жанра песень, але і ў яе драматургіі. Так, на сцэне ў оперы дзейнічаюць музыканты, акампаніруючы гульням дзеючых асоб (сцэна «Мяцеліцы»). Ад батлеечных прадстаўленняў ідзе фінальны хор оперы, дзе дзеючыя асобы звяртаюцца да публікі:

Здаваленне, якое адчуць мы
гатовы,
Будзем помніць удзячна у
кожнае хвілі,
Калі публіка шчыра нам
скажа хоць слова.
Што ігрою сваёй мы яе
захапілі.

У фінале першай дзеі Дунін-Марцінкевіч праяўляе сябе майстрам масавых оперных сцэн. Так, ён індывідуалізуе групы дзеючых асоб сваёй рэмаркай: хор дворных, хор сялян, танцоры.

Дзейнасць Дуніна-Марцінкевіча ў галіне музычнага тэатра адносіцца да яскравых старонак мінулага Беларусі. Яна чакае глыбокіх даследаванняў.

С. НІСНЕВІЧ.

Выданні твораў

Першым творам Дуніна-Марцінкевіча, які пачаўся ў друку, было лібрэта оперы «Сялянка» (1846). Кніга выйшла ў Вільні ў колькасці 600 экземпляраў. Пасля ў Мінску выйшла другая кніга пісьменніка—паэма «Вечарніцы» і меладрама на польскай мове «Вар'ят» (1855). У гэтым-жа годзе асобным выданнем выходзіць паэма «Гапон» і некалькі вершаў паэта на беларускай і польскай мовах. Паэма «Гапон» потым двойчы перавыдавалася: у 1889 г. у «Календары Поўночна-Заходняга краю» і ў 1908 г. у Пецербургу, у выдавецтве «Загляне сонца і ў наша аконца». Неўзабаве выходзяць зборнікі «Цікавішся? — Прачытай!» (1856) і «Дудар беларускі або ўсяго патроху» (1857).

Творы Дуніна-Марцінкевіча выходзілі ў выдавецтве «Загляне сонца і ў наша аконца» («Вечарніцы», «Шчароўскія дажынкі»).

Пасля Кастрычніцкай рэволюцыі ўпершыню паявіліся ў друку драматычныя творы «Пінская шляхта» і «Залёты», а ў пасляваенны час паэмы «Травіца — Брат-сястрыца» «Быліцы, расказы Навума», «Халімон на каранацыі». У совецкі час неаднаразова выходзілі выбраныя творы Дуніна-Марцінкевіча, паасобныя паэмы і камедыі змяшчаліся ў розных хрэстаматыях і зборніках.

У сувязі са 150-годдзем з дня нараджэння пісьменніка Дзяржаўнае выдавецтва БССР падрыхтавала да друку аднатомнік твораў Дуніна-Марцінкевіча. У аднатомніку будуць змешчаны, апрача вядомых твораў, найбольш цікавыя вершы і паэмы, напісаныя на польскай мове. Чытач пазнаёміцца з паэмамі «Літаратурныя клопаты» (пераклад П. Пранузы), «Благаславёная сям'я» і «Хіба я стары?» (пераклад А. Зарыцкага), «Люцынка альбо шведы на Літве» (пераклад С. Дзергая), «Славяне ў XIX стагоддзі» (пераклад А. Звонака) і лірычныя вершамі ў перакладзе М. Хведаровіча і Н. Чарнушэвіча.

Хіба я стары?

УРЫВКІ

(Друкуецца на беларускай мове ўпершыню)

III.

Стары я, гавораць, бо палову веку
Ужо давялося пражыць чалавеку.
Хто гэтак гаворыць, бачыць неглыбока:
Глядзіць яшчэ вельмі зорка маё вока,
Рука яшчэ мае дастаткова моцы,
Спатрэбіцца ў працы, прыгадзіцца ў бойцы!
Чытаў і не раз я ў кнігах бывала,
Што продкі ва ўзросце, вось,як мой, з закалам
На бой ішлі мужна, ворагаў грамілі,
Айчыну з адвагай сваю баранілі.
І нашы парабкі адкідалі жарты,
Калі хто з герояў тых, пашаны варты,
Браў жонкай дзяўчыну, векам маладую,

Але толькі векам — розумам старую.

Часта ў мудрым вочку думка мігацела, —
Хай муж пасівелы ды глядзіць ён смела.
І кунтуш і шабля, бярэ рукі ў бокі,
Прытупне ды гікне і пайшоў у скокі!
Не тое сягоння, нават думаць сумна.
Ледзь школу закончыць хлопец неразумны,
Як баба раскісне, марай паланёны.
Удзень шпацыруе, увечар салоны
Наведвае гэты ветрагон аслаблы
І носіць ларнетку замест вострай шаблі.
Герой бальных танцаў і чаркі звінчастай
Нібыта індык выхваляецца часта.
Аб мове бацькоў ён пачаў забывацца:
Баіцца, што будуць ў салонах смяяцца.

Калі-ж афяруюць жанчыны пустыя
Такой маладосці пачуцці святыя,
Дык я не злуюся тады з той прычыны,
Што клічуць старым мяне часта жанчыны.

IV.

Я, — кажуць, — здзяцінеў праз старасць і вершы
І стаў вершаплётам у воласці першым.
Не будуць-жа знаўцы французскае мовы
Мужыцкай гаворкай засмечваць галовы:
«Сялянскія словы, фі, як непрыгожа,
Абраза салонаў, нам гэта нягожа!

Навошта нам трэба з мужыком яднацца?
Служыць абавязан ён нам сваёй працай.
Аддаць свой здабытак — вось доўг селяніна,
Нахабны народ, усе просяць няспынна.
Давай дапамогу галодным, убогім.
Якая-ж карысць нам ад той дапамогі?

Каб бліжнім сваім зрабіць кожнага старца,
Ці долю для кожнага даць галадранца,
Для гэтага грошай не хопіць і часу.
Без грошай ні кроку. Вось трэба атласу
Купіць на сукенку. Вось трэба па густу
Набыць пару тузін батыставых хустак;
А футры каштоўныя, шоўк і саеты,
Балы, маскарады, абеды, банкеты?

І ўсё, што за год атрымаў, паляцела.
Яшчэ каб нам нэндза чыясьці балела!
Стары звар'яцеў, што пляце, сам не знае,
Халопскія вершы чытаць прымушае!»
Для вас, паны, шкода халопскай мне мовы,
Для вас, чые мудрыя надта галовы,
Манеры салонаў засвоіўшы ўмела,
Смяюцца з таго, крытыкуючы смела,
Што тут адраджаецца на родных глебах,
Чужое-ж, хай кепскае, ўзносяць да неба.

Ваш суд мне не страшны, хай злосна скавыча
У будцы сабака, увагі на пса не звярну я.
Як раіць пясняр Сыракомля, пішу я
Цяпер, як заўсёды, на мове мужычай.
Вы-ж ў вершах шукаючы вады ўсялякай,
Крычыце—«Здзяцінеў стары небарака!»

Мінск, 16 лютага 1856 г.

Пераклаў з польскай мовы **А. ЗАРЫЦКІ.**

На шляху да рэалізма

Паэтычная творчасць В. Дуніна-Марцінкевіча сваімі вытокамі выходзіць з беларускага фальклору. Што датычыцца драматургіі пісьменніка, дык гэтае пытанне не даследавалася, ды і разглядаліся звычайна ўсяго тры творы: «Сялянка», «Пінская шляхта», «Залёты». Між тым, п'есы і лібрэта камічных опер і аперэт, напісаныя на польскай мове, маюць значную цікавасць, дапаўняючы наша ўяўленне аб творчасці Дуніна-Марцінкевіча.

Першы твор пісьменніка быў драматычным — лібрэта камічнай оперы «Рэкруцкі набор». Не оперу «Сялянка» трэба лічыць пачаткам літаратурнай дзейнасці пісьменніка, а вышэй названы твор, які быў пастаўлены ў Мінску ў 1841 г. Заканамерна, што пісьменнік пачаў сваю творчасць з драматургіі. Ён жыў у асяроддзі аматараў сцэнічнага мастацтва, сам спрабаваў сілы ў якасці акцёра і рэжысёра. У яго хаце частымі гасцямі былі кампазітары, музыканты, мастакі, паэты, якія таксама захапляліся тэатрам і раілі свайму сябру развіваць іменна драматургічныя здольнасці. А пра тое, што гэтыя здольнасці ў Дуніна-Марцінкевіча былі, сведчыць нават яго паэзія, дзе размоўныя інтанацыі і драматычныя элементы займаюць, бадай што, асноўнае месца.

Пад уплывам народнай драматургіі і народнага беларускага тэатра фармаваўся талент будучага пісьменніка. Раннія п'есы і лібрэта В. Дуніна-Марцінкевіча збліжала з народнай вуснай драматургіяй не толькі асобнае падабенства сцэн і сюжэтаў, а перш за ўсё агульны кірунак жанра: вастрыня сюжэта, павучальнасць, яркая і жывая народная мова, элементы гумару і сатыры. Мы з поўным правам можам сцвярджаць, што арыгінальная творчасць першага беларускага камедыёграфа В. Дуніна-Марцінкевіча нараджалася на народнай аснове.

У лібрэта камічнай оперы «Рэкруцкі набор» паказваецца ў саркастычна-гумарыстычным плане разбурэнне патрыярхальнай яўрэйскай сям'і. Бацька не хацеў аддаць сына ў рэкруты, дык згубіў дачку; яе, пераапранутую ў адзенне брата, звёз салдат. Тут і элемент пераапранання, і займальнасць, і разам з тым праводзіцца думка, што людзі не вельмі ахвотна здавалі дзяцей у салдаты. Дарэчы, тэма рэкруцтва закранаецца аўтарам і ў паэме «Гапон», а некаторыя даследчыкі (як Р. Земкевіч) лічаць, што драматург іменна на гэтую тэму напісаў яшчэ некалькі іншых лібрэта. Магчыма, гэта тыя самыя творы, што мы разглядалі вышэй, а магчыма, нешта новае. Даследчык творчасці выдатнага польскага кампазітара С. Манюшкі— А. Валіцкі называе яшчэ «Бойку музыкаў» і «Цудоўную ваду», якія на яго думку, напісаў наш драматург.

Сюжэт двухактовага лібрэта камічнай оперы «Сялянка» крыху ўскладнёны рознымі другараднымі лініямі, якія паглыбляюць твор і робяць яго драматургічна і сцэнічна больш удалым. Інтрыга тут заблытваецца другімі пабочнымі сцэнамі, што толькі яшчэ больш абвастрае дзею.

Нават невялікая сцэнка «Наспадзяванка для майстрыні» (1854) напісана ў форме віншавальнага імяніннага прывітання. У народным тэатры віншавальных форм і сцэнак было надзвычай шмат. Але справа тут не проста ў віншаванні, а перш за ўсё ў павучальнасці.

Працягваючы развіваць традыцыі беларускай вуснай народнай драматургіі, В. Дунін-Марцінкевіч увесь час удасканальвае сваё майстэрства. Вершаваныя творы «Хіба я стары?» і «Літаратурныя клопаты» ясна гавораць аб тым, што як вершаваная, так і драматургічная творчасць яго цесна звязана з фальклорам. Аднак гэта не значыць, што ён адгараджваў сябе ад літаратурнай спадчыны. Як пісьменнік В. Дунін-Марцінкевіч выхоўваўся пад значным уплывам польскай, рускай і ўкраінскай літаратур.

Аб гэтым сведчыць, напрыклад, меладрама ў пяці абразках «Вар'ят» (1855), напісаная па матывах IV часткі драматычнай паэмы «Дзяды» А. Міцкевіча. Як вядома, польскі паэт напісаў гэты выдатны твор па матэрыялах беларускага фальклору. Таму паэма і блізкая для нашага драматурга. Напісана меладрама ў гратэскава-парадыйным плане.

У канцы свайго творчага шляху В. Дунін-Марцінкевіч становіцца на шлях рэалізма, пачынае глыбей разумець і бытавыя, і социяльныя з'явы. Перыпетыі ўласнага жыцця, судзейская дзейнасць, прабыванне на вёсцы далі магчымасць аўтару вывучыць больш глыбока ўзаемаадносіны шляхты і сялян, чыноўніцтва і простых людзей. Усё гэта адлюстравалася ў камедыях вадэвільна-фарсавага характару — «Пінская шляхта» (1866) і «Залёты» (1870).

Абодва творы сатырычныя. Буржуазная крытыка па сутнасці адмаўляла гэтыя лепшыя творы беларускага драматурга. Яна спрабавала кананізаваць некаторыя памылковыя погляды нашага драматурга, у прыватнасці, у дачыненні да шляхты, падзяляючы яе на добрую і дрэнную. Аднак факт застаецца фактам: В. Дунін-Марцінкевіч высмейвае фанабэрлівых шляхцюкоў Пратасавіцкага і Цюхай-Ліпскага. Асмяянне ідзе як у социяльным, так і ў бытавым плане. Не любіць драматург і судовае чыноўніцтва—Кручкова і Пісулькіна.

Лірычная лінія ў «Пінскай шляхце» ўвасоблена ў вобразах маладой пары Марысі і Грышкі. Гэта другі план. Наш драматург — талент сатырычнага складу: на першы план ён заўсёды вылучае з'яву, з якою трэба змагацца, а на другім плане якраз тое, што трэба сцвярджаць.

У «Залётах» свае рэалістычныя прынцыпы драматург выявіў найбольш ярка. Кулак Сабковіч нажываецца на махлярстве, ашукваючы служанку, сталяра, у сялян бярэ штраф кажухамі. Ні сумлення, ні сэрца ў яго няма, асноўнае ў яго жыцці—нажыва. У камедыі высмейваюцца і духавенства, і суд, і ваенная муштра—тыя элементы капіталістычнага ладу, на якіх ён трымаецца. Асмейванне гэта ідзе ў плане народнага тэатра і народнай драматургіі. Сцэны народнага тэатра адчуваюцца ў эпізодзе пакражы кабылы ў бацькоў Марылі—Гапона і Куліны. У вобразе парабка Петрука відаць і розум, і працавітасць, і дасціпнасць — рысы, характэрныя для простага чалавека ў народнай драматургіі і тэатры.

Творчая спадчына В. Дуніна-Марцінкевіча, якая спрыяла развіццю беларускай нацыянальнай драматургіі, патрабуе яшчэ дэталёвага даследавання і вывучэння.

Алесь ЕСАКОЎ.

ТАМ, ДЗЕ ЖЫЎ ПЯСНЯР

НАД БЕРАЗІНОЙ

Першы марозік моцна скаваў зямлю, у паветры кружацца рэдкія сняжынкі — прадвеснікі і разведчыкі блізкай зімы.

Дзянёк выдаўся пагодлівы, сонечны. Але на небе нейкая пьмяная туманная павалока, якая паказвае, што збіраецца пайсці снег. Вецер дзьме не вельмі густы, затое пранозлівы і волкі. На пагорку, пры самым беразе ракі, глуха шумяць выносістыя хвоі.

Толькі Беразіна, вада ў якой пацямнела ці ад холаду, ці ад хмурага неба, спакойна і велічна коціць сваю плынь. Хвалі бягуць ля берага, і глуха шамаціць пасохлы чаротнік.

Па грудку між кустоў арэшніку стаяць зубы са збітым верхам. Гэта, відаць, сляды колішніх баёў у Бабруйскім катле. Тут-жа пры самым беразе можна бачыць і выгінастую лінію акопаў, што абваліліся, зараслі дзярном і дрэўцамі, але захавалі свой профіль.

Вакол прасціраюцца калгасныя палеткі, якія ўпіраюцца ў хвойнік і сцяну беразнячку. Вялікая лава канюшынішча дахоўзіць да рачулкі, абапал якой цягнецца вузкая паласа сенажаці. За ручайком на ўзгорку маленькі пасёлак, хат так дзесяць—пятнаццаць. А збоку, між кустоў і пакалечаных дубоў, узвышаецца заводскі комін — да Бабруйска тут рукой падаць. Пасёлак — гэта Панюшкавічы, радзіма беларускага пісьменніка Вінцэнта Іванавіча Дуніна-Марцінкевіча.

Дзесьці тут быў шляхецкі двор Панюшкавічы, у якім жыў бацька пісьменніка Ян Дунін-Марцінкевіч, што арандаваў у свайго родзіча гэты фальварак. Цяпер нідзе і следу няма ад жылля, што стаяла некалі над Беразіной. Толькі ў адным месцы ля ручайка можна заўважыць дзірван і кусты здзічэўшага бэзу, што засталіся, відаць, ад сядзібы. Дый і не дзіўна: прайшло паўтара вякі, як недзе тут бегаў жвавы хлапчук Вінцусь, будучы аўтар «Пінскай шляхты».

Ідзем у вёску, каб пагутарыць са старымі людзьмі. Хлапчукі, якія ідуць са школы, паказваюць хату Міхайла Шавеля, якому ўжо 84 гады.

Заходзім у хату. Гаспадара няма дома: ён на калгасным двары ў суседняй вёсцы Шчаткава возіць салому. Гаспадыня ўходжвалася ля печы. Пачынаем размову.

— Было тут за маю памяць два фальваркі, — кажа Ганна Шавель. — Адзін вунь: там ля ручайка, дзе канюшынішча, другі за тымі дубамі, бліжэй да Шчаткава. У адным жыў пан Савініч, а ў шчаткоўскім забыла ўжо хто...

Савініч? Штосьці знаёмае. Праглядаю свае запісы і знаходжу: «Панюшкавічы—фальварак над безыменным прытокам Бе-

(Заканчэнне на 4-й стар.)

ЮБІЛЕЙНЫЯ СПЕКТАКЛІ

На сцэне лірычная камедыя

Закрылася заслона пасля апошняй карціны спектакля «Калі цвіце акацыя» (тэатр імя Якуба Коласа). Знаёмыя гледачы, хутка апрануўшыся, сустрэліся каля выхадных дзвярэй Мінскага акруговага Дома афіцэраў, дзе паказвалі юбілейны сцэнічны твор. Настрой у іх быў вясёлы. З кароткай размовы, якая адбылася паміж сябрамі, можна было зразумець, што яны шмат пасмяяліся, добра адпачылі і не шкадуюць, што патрацілі вечар у гасцях у коласаўцаў.

Але ўжо з гэтай размовы стала ясна, што спектакль не выклікаў глыбокага роздуму, не ўзбагаціў ён і больш дасканалым веданнем жыцця. Ды і смех часам узнікаў ад нечаканых сцэнічных сітуацый (напрыклад, у сцэне з пасылкай), а не ад дасціпнага дыялагу і рэжысёрскай задумы.

І ўсё-ж у спектаклі знайшлося нешта такое, што вабіць да яго і не пакідае абыякавым, нягледзячы на тое, што камедыя Н. Віннікава даволі банальная, а канфлікт не новы.

У рэжысуры В. Броўкіна і ў некаторых вобразах вабіць хараство, непасрэднасць і шчырая палымянасць маладосці, не растрачанай юнацкай энергіі, багацце мяккага гумару, сатырычная вастрыня. Знойдзены і своеасаблівы дынамічны рытм камедыйнага спектакля.

Сцэны ў студэнцкім інтэрнаце і ў гарадскім парку багатыя іскрыстай камедыйнасцю і юнацкім свавольствам. Нажаль, яно часам пераходзіць у эстрадную лёгкадумнасць, у ігру на публіку. Але гэта толькі ў паасобных эпізодах.

В. Броўкін захапляе творчы калектыў бурным тэмпераментам, багаццем фантазіі, палемічнай завостранасцю задумы, улюбёнасцю ў герояў п'есы. Гэтая рыса таленту маладога рэжысёра дала ўжо цікавыя вынікі ў спектаклях «Цудоўны сплаў» і «У добры час».

І на гэты раз сугучнасць задумы пастаноўшчыка настрою ўсіх стваральнікаў спектакля спрыяла нараджэнню сцэнічнага твора, пазбаўленага халоднай абыякавасці, багатага лірыкай і гумарам.

Трапныя знаходкі і Я. Нікалаева. Ад яго дэкарацый (асабліва ў экстэр'ерах) павявае вясеннім водарам акацый, сонечным святлом і паўднёвай цеплынёй.

Дакладны стыль, у якім вырашана камедыя рэжысёрам і мастаком, станоўча адбіўся і на вобразах герояў.

У спектаклі выразна загучалі галасы чулага «сухара» — дырэктара інстытута Сухарава (вобраз надзвычай інтэлектуальны ў выкананні Ц. Сяргейчыка), студэнтаў Ільі Шацілава (Н. Яроменкі) і Ганны (Г. Арловай). Аднак маладым артыстам хацелася-б парэзіць, па прыкладу іх старэйшага партнёра, дамагчыся большай глыбіні ў распрацоўцы канфлікта.

Дасціпная, іранічная інтанацыя — характэрная рыса ролі дацэнта Камароўскага, якую ярка іграе артыст Б. Левін, і ролі міліцыянера (артыст Я. Буракоў). Ёсць і іншыя акцёрскія ўдачы ў спектаклі.

Нажаль, каментатар ад аўтара (артыст М. Федароўскі) празмерна скаваны. Небездакорная і яго дыкцыя.

З усяго гэтага, зразумела, не вынікае, што «Калі цвіце акацыя» — спектакль, якім сказана нейкае новае слова ў жанры лірычнай камедыі. Але ён і не з'яўляецца алыходам ад прынцыповай творчай пазіцыі тэатра. Гэты спектакль мае сваіх гарачых прыхільнікаў і сур'ёзных апанентаў. Дыскусія сведчыць, што і спрэчныя спектаклі, калі яны грунтуюцца на метадзе сацыялістычнага рэалізма, маюць права на існаванне ў рэпертуары тэатра.

Хацелася-б толькі шчыра пажадаць мастацкаму кіраўніцтву калектыву, не парушаючы прыроды жанра, больш патрабавальна ставіцца да якасці драматургіі камедыйных твораў, а таксама дамагацца высокага майстэрства і сапраўднай глыбіні іх сцэнічнага ўвасаблення.

З. ІЛЬІН.

На здымку: сцэна са спектакля.

Яркія, змястоўныя канцэрты

У цэнтры горада Ліда, непадалёк ад сцен старажытнага замка, узвышаецца вялікі двухпавярховы будынак. Гэта гарадскі Дом культуры. Сюды вечарамі збіраецца моладзь — служачыя ўстаноў, рабочыя абутковай фабрыкі, завода сельскагаспадарчых машын, фабрыкі хімкультпрадметаў і іншых прадпрыемстваў горада. Тут ёсць дзе павесяліцца — прасторнае фойэ, добрая глядзельная зала. З густам афармлены фотавітрыны, прысвечаныя падзеям незабыўных дзён Вялікага Кастрычніка і дасягненням совецкага народа за сорак год.

Мы звярнуліся да загадчыка Барыса Аляксандравіча Шаталава з просьбай расказаць аб рабоце гарадскога Дома культуры.

— Пры нашым Доме культуры, — сказаў Б. Шаталаў,— ёсць хор, драматычны і танцавальны калектывы, духавы аркестр. Рэгулярна праводзяцца заняткі з групай салістаў. У бліжэйшы час мяркуем стварыць аркестр народных інструментаў. У рэпертуары хору, які налічвае 75 чалавек, — беларускія, рускія, украінскія песні. У прыватнасці, да свята саракагоддзя Вялікага Кастрычніка былі падрыхтаваны такія песні, як «Варшавянка», «Смело, товарищи, в ногу!», «Партыі слава», «За горою, у колодца» і іншыя. На абласным фестывалі ў гэтым годзе хор атрымаў дыплом другой ступені. Кіраўнік хору Генадзій Багдановіч прыкладае шмат намаганняў, каб рэпертуар быў цікавым. Танцавальны калектыў атрымаў дыплом першай ступені.

— Заходзьце, калі ласка, заўтра да нас, — закончыў свой расказ тав. Шаталаў, — мастацкая самадзейнасць Дома культуры дае канцэрт — пабачыце самі.

На другі дзень увечары мы былі зноў у Доме культуры на канцэрце. Па тым, як рэагавалі гледачы на выступленні самадзейных артыстаў, можна было меркаваць аб узроўні выканання.

Вось на сцэну выйшаў невысокі юнак — вучань сярэдняй школы Юры Палей. Зала насцярожана прыціхла і чакае. Яшчэ момант — і са сцэны плывуць пранікнёныя, поўныя лірызму словы:

Ой, Нёман, ой, бацька мой Нёман,
Як сонца, як дзень дарагі...

Добра спявае Юры Палей.

Не менш цёпла сустракаюць гледачы і выступленне Валянціны Дзедавец, якая выканала песні «Дэлегатка» і «Калгасная полька». Цікавымі былі акрабатычныя эцюды ў выкананні работніцы Лідскай абутковай фабрыкі Таццяны Багрыцэвіч, а таксама выхаванак дзіцячага дома Габіс, Карэцкай і Кокаш.

Захапленне выклікалі невялічкія інтэрмедыі на надзённыя тэмы ў выкананні мастацкага кіраўніка Дома культуры Калабеніна і работніка абутковай фабрыкі Зялінскага.

— Гэта нашы Тарапунька і Штэпсель,—гавораць жыхары горада пра іх. Калабенін і Зялінскі самі складаюць сатырычныя куплеты, у якіх высмейваюць п'янства, рэлігійныя забабоны, бракаробаў і інш. і па-майстэрску іх выконваюць.

Лепшым нумарам канцэртнай праграмы быў беларускі народны танец «Бульба» ў выкананні танцавальнага калектыву. Прыгажосць, імклівасць, а галоўнае — вясёлы запал танцораў зачаравалі гледачоў. Відаць, нездарма калектыў узнагароджаны дыпломам першай ступені.

Многія гурткі мастацкай самадзейнасці пры Доме культуры рэгулярна працуюць ужо некалькі год. Драматычны калектыў у пачатку 1957 г. адзначыў свой дзесяцігадовы юбілей. За гэты час ім было пастаўлена каля ста пастановак.

Вялікую культурна-масавую работу праводзіць гарадскі Дом культуры ў час перадвыбарчых кампаній. Самадзейных артыстаў можна сустрэць на імправізаванай сцэне агітпунктаў горада. У перыяд уборкі ўраджаю ствараюцца агітбрыгады, якія выязджаюць з канцэртамі ў калгасы раёна. Толькі ў гэтым годзе агітбрыгадай дадзена ў калгасах звыш семідзесяці канцэртаў.

А. ТРАЯНОЎСКІ,
У. САРОКА.

У раённым Доме культуры

За апошні час у Дубровенскім раённым Доме культуры адбыліся канцэрты і спектаклі прафесіянальных і самадзейных калектываў.

Цікавым быў «Вечар сатыры і гумару» па творах Чэхава. Артысты Беларускай дзяржаўнай эстрады Шахалаў, Ланская, Благадатная і Лебедзеў у тэатралізаванай форме выканалі вядомыя творы Чэхава «Кіраўніцтва для жадаючых жаніцца», «Трагік па няволі», «Аб шкодзе тытуню», «Ноч перад судом» і інш.

Танцавальная група і салісты хору Маладзечанскага ансамбля песні і танца пад кіраўніцтвам заслужанага артыста БССР А. Білібіна пазнаёмілі дубровенцаў з песнямі і танцамі народаў СССР і краін народнай дэмакратыі. Асабліва цёпла былі сустрэты салісты балету Чыркоў і Данілаў, салісты хору Шаўрук і Хаўранкоў.

Беларускі дзяржаўны драматычны тэатр імя Якуба Коласа паказаў драматычную п'есу Эрыха Марыі Рэмарка «Апошні прыпынак». У спектаклі прымалі ўдзел народны артыст СССР А. Ільінскі, народныя артысты БССР М. Звездачотаў і А. Трус, заслужаныя артысты БССР Е. Мацісава і Ф. Шмакаў.

Драматычны калектыў РДК паказаў спектакль «Юнацтва бацькоў» па п'есе Б. Гарбатава.

А. МАЦЫЛЕВІЧ,

Віцебская вобласць.

Аматары класічнага танца

У светлым, утульным пакоі гучыць музыка, то пяшчотная і плаўная, то бравурная і імклівая. Дзяўчынкі ў белых лёгкіх сукенках навучаюцца тут класічнаму танцу. На здымку—адзін з момантаў урока ў класе выкладчыка Р. Чэрэхоўскай.

У Палацы культуры профсаюзаў (Мінск) створаны ўсе ўмовы для мастацкага навучання дзяцей. Тут арганізаваны харавы калектыў, аркестр народных інструментаў, драматычны гурток і музычная школа.

У дзевяці групах харэаграфічнага калектыву навучаецца звыш двухсот чалавек. У рэпертуары юных выканаўцаў беларускія, украінскія, рускія, маладаўскі, кітайскі і чэшскі народныя танцы. Разам з харавым калектывам будучыя балерыны выконваюць кампазіцыю «Куранятка».

Па класу выкладчыкаў Н. Малахавай і Р. Чэрэхоўскай (класічны танец) да новагодняга свята рыхтуюцца выступленні дзіцячага балету.

Да 1 Мая калектывам мяркуецца паставіць балетны спектакль у трох актах «Чырвоная шапачка» (лібрэта Р. Чэрэхоўскай, музыка кампазітара І. Ронькіна).

Тэкст і фото **І. Маркава.**

Братняя дружба

Звыш дзесяці год працягваецца дружба паміж калектывам Лаўгаўпілскага рускага драматычнага тэатра і працоўнымі Браслаўскага раёна Маладзечанскай вобласці. За гэты час тэатр наведаў Браслаў больш чым 80 разоў, паказваючы штогод па 8—9 спектакляў.

Кожны раз вестка аб прыездзе латвійскіх майстроў сцэны сустракалася браслаўчанамі з вялікай радасцю. З кожным новым спектаклем гледачы з задавальненнем адзначалі растучае майстэрства акцёраў. Працоўныя Браслава па заслугах ацанілі ігру заслужаных артыстаў ЛССР Фарыноўскага, Каранеўскага, Радчанкі, заслужанага артыста РСФСР Мачнасава, артыстаў Ізюмавай, Кудрашовай, Батурына і іншых, якія стварылі шэраг рэалістычных вобразаў.

Тэатр выступаў у раённым цэнтры і перад працоўнымі Слабодскага сельсавета, перад калгаснікамі сельгасарцелі імя Леніна, перад працоўнымі Відзаўскага і Полацкага раёнаў рэспублікі.

Калектыў тэатра дапамагае ўдзельнікам мастацкай самадзейнасці дамоў культуры. Артысты бываюць на самадзейных спектаклях, гутараць з моладдзю аб рабоце над вобразамі.

Сёлета калектыў тэатра паказаў беларускаму гледачу новыя пастаноўкі. Толькі ў кастрычніку і лістападзе браслаўчане ўбачылі два спектаклі: «Я цябе знайду» Е. Успенскай і Л. Ошаніна і «Канец — справе вянец» В. Шэкспіра.

У снежні тэатр зноў наведаў Браслаў. Днём яго калектыў выступіў у в. Слабодка, а ўвечары — на сцэне раённага Дома культуры, паказаўшы новую работу — п'есу «Рэцэпт шчасця» румынскага драматурга Аурэла Баранга. Пасля спектакля, які быў цёпла сустрэты гледачамі, загадчык раённага аддзела культуры т. Захараў ад імя працоўных раёна ўручыў калектыву тэатра грамату райвыканкома і райкома КПБ. Гэта ўжо другая грамата за культурнае абслугоўванне працоўных раёна.

Прымаючы грамату артыст Фарыноўскі горача падзякаваў за ўзнагароду і запаўніў, што калектыў тэатра зробіць усё для таго, каб дружба і культурныя сувязі двух братніх совецкіх народаў з кожным днём раслі і мацнелі.

Днямі стала вядома, што першы рускі драматычны тэатр у Прыбалтыцы быў заснаван у 1857 г. ў Дзінабургу (так тады называўся Даўгаўпілс). Два гады тут працаваў вядомы акцёр Александрынскага тэатра (цяпер тэатр імя Пушкіна ў Ленінградзе) Пётр Міхайлавіч Мядзведзеў.

Зараз калектыў тэатра і грамадскасць Даўгаўпілса рыхтуецца да 100-гадовага юбілея тэатра, які будзе адзначацца ў студзені 1958 г. Працоўныя Браслава таксама горача вітаюць юбіляраў і жадаюць ім далейшых творчых поспехаў у імя любімай Радзімы, у імя братняй непарушнай дружбы народаў нашай краіны.

А. ІВАНОЎСКІ,

Браслаўскі раён.

ТАМ, ДЗЕ ЖЫЎ ПЯСНЯР

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)

разіны, Бабруйскі павет, 9 кілометраў ад Бабруйска, на тракце ў Свіслач; з 1869 года ўласнасць чыноўніка Савініча. Тут нарадзіўся пісьменнік В. Дунін-Марцінкевіч, які памёр 17 снежня 1884 года» («Польскі геаграфічны слоўнік», том VII, ст. 842).

Ганна Шавель расказвае, што маёнтак Савініча меў такі выгляд: невялічкі двухпавярховы драўляны дом з балконам, ля яго дрэвы, пераважна дубы, вакол сад, побач гаспадарчыя пабудовы і маленькая царква.

Тут, у гэтым ціхім і маляўнічым кутку над Беразіной, прайшлі дзіцячыя і юнацкія гады беларускага пісьменніка. Яшчэ хлапчуком Дунін-Марцінкевіч бачыў, як шчаткаўскія і сычкаўскія сяляне спраўлялі народныя святкаванні — купалле, дажынкі, дзяды. Недалёка ад Панюшкавіч па дарозе на вёску Сычкава стаяла карчма— месца зборышча ваколічных жыхароў. Тут Вінцук чуў народныя песні, паданні і казкі, наглядаў, як сяляне танцуюць «Лявоніху», «Мяцеліцу» ці «Бычка».

Пазней, ужо ў сталыя гады Дунін-Марцінкевіч зрэдку наведваў родныя бабруйскія ваколіцы. Быў ён тут у 1849 і ў 1854 гадах, калі ехаў на Палессе — у Мазыр і Ольпень, гасцяваў у сваіх знаёмых у вёсках Карытна і Тарасевічы. Бываў Дунін-Марцінкевіч у Глуску, калі яго добры знаёмы мясцовы жыхар Валеры Паўловіч паставіў у мястэчку сіламі аматараў «Сялянку». У Карытна 5 жніўня 1868 года быў напісаны верш «Заўтра Спаса, кажуць людзі», у якім успамінаюцца тутэйшыя знаёмыя:

«Заўтра Спаса, кажуць, людзі.
У Тарасевічах кірмаш будзе:
Трэба ехаць, падзівіцца...
Потым шмыгнуць да двара
Павіншаваць гаспадара».

ПЕРШЫ СПЕКТАКЛЬ

Яшчэ зранку на плоце каля вялікага, як стадола, дома пана Поляка на Саборнай плошчы, дзе часта адбываліся тэатральныя відовішчы, з'явілася афіша:

«С дозволения начальства.
В субботу, 9 февраля 1852 г. будет представление г. г. любителями в пользу бедных.
Опера в двух действиях на польском и простонародном языке.
Сочинение Викентия Мартинкевича с музыкой Манюшки, Кржижановского и прочих под заглавием

«Селянка»

Гарадавы, які, згорбіўшыся ад марозу, тупаў непадалёку, убачыў, што прахожыя спыняюцца ля аб'явы. Ён падышоў бліжэй, прачытаў, памкнуўся было пайсці запытаць, хто дазволіў вывесіць афішу, але натрапіў на словы: «С дозволения начальства», падумаў і паплёўся на сваё месца.

У гэты час у доме пана Поляка кіпела работа. Члены аматарскага гуртка, які налічваў звыш дваццаці чалавек, амаль усе былі ўжо ў зборы. Не хапала толькі Авяр'яна Васільева, які быў за адміністратара, і акцёра на ўсе ролі вясёлага Ляўданскага. Распарадчыкам быў мажны каржакаваты мужчына гадоў пад сорак пяць. На яго шырокім адкрытым твары, у блакітных вачах свяціліся адначасова заклапочанасць і радасная ўсмешка. Быў ён не па сваіх гадах і камплекцыі ўвішны і рухавы. Напяваючы нейкую мелодыю, ён то падыходзіў да мастака Адама Шэмеша, які заканчваў афармляць дэкарацыі, то ішоў за кулісы, дзе грыміраваліся акцёры. Гэта быў аўтар «Сялянкі». Тут-жа ў зале была яго жонка Юзэфа. Старэйшыя дочкі пісьменніка Марыя і Цэзарына прымяралі касцюмы — яны сёння выступалі ў спектаклі.

Дунін-Марцінкевіч хваляваўся. Засталося ўсяго дзве гадзіны да пачатку прадстаўлення, а яшчэ няма часткі акцёраў— сялянскага хору з Люцынкі, удзельнікі якога будуць выступаць і ў масавых сцэнах оперы. Накінуўшы паліто, ён вышаў сам глянуць, ці ёдуць спевакі. На плошчы было пуста, толькі ля царквы дыбалі нізенькі і шчуплы пісар міравога суддзі Васільеў і высокі і статны Ляўданскі, якія халэзілі разносіць афішы па горадзе і запрашаць на спектакль. Былі яны стомленыя, але радасныя.

— Ну, як справы? — запытаў Дунін-Марцінкевіч.

—Збор будзе добры, — адказаў Васільеў. — Частку білетаў ужо прадалі... Забарона спектакля выклікала да яго яшчэ большую цікавасць...

— Нічога, у мяне дазвол ад гараднічага ў кішэні, — адказаў пісьменнік. — Няхай той Кручкоў паскача, а загада гараднічага ён не адменіць... А вось і мае харысты...

Сапраўды, з-за горкі паказаліся двое параконных саней, якія развярнуліся ля ратушы і ўзялі кірунак да дома Поляка.

...У зале было паўнютка народу, калі адкрылася заслона. Першы акт пачаўся маляўнічай сцэнкай у карчме. Мастак пастараўся перадаць тыповы выгляд гэтага месца гульбішч і святкаванняў у вёсцы. Каларытна выглядалі сяляне з Люцынкі, якія без усякага грыму і змены вопраткі з'явіліся ў карчме. Упершыню на сцэне былі сапраўдныя мужыкі, у сваіх світках і лапцях. І нават гарэлку пілі сапраўдную — з дарогі трэба было пагрэцца.

Пасля хор сялян заспяваў:

Ой, бяда-ж будзе, бяда,
Прышла на нас чарада!
Скажыце-ж, добры людзі,
Ды што-ж з гэтага будзе?

З поспехам выступаў у ролі Наума Прыгаворкі сам аўтар са сваімі дочкамі...

Гэта быў першы і апошні спектакль перад гледачом у памяшканні тэатра. Але «Сялянку» аматарскі гурток ставіў у Мінску не раз і пазней, у 1853 і 1855 гадах. Для гэтага выкарыстоўвалі кватэру пісьменніка, ставілі оперу ў доме Свіды, Лапіцкай і Ляўданскага. Апрача дачок, у Дуніна-Марцінкевіча былі актыўныя памочнікі — пісар Авяр'ян Васільеў і работнік друкарні Ляўданскі — вельмі здольны акцёр. Цікава адзначыць і тое, што «Сялянка» ставілася на самадзейнай сцэне не толькі ў Мінску, але і ў Слуцку, Бабруйску і Глуску. Поспеху оперы садзейнічала, відома, і музыка, напісаная Манюшкам. Асаблівай папулярнасцю карысталася арыя «О, як міла ў вясковым зацішку».

ЛЮЦЫНКА

Трапіць у Люцынку нам давялося ў самы разгар лета. Ліпеньскім ранкам, калі горад толькі-толькі абуджаўся, каб пачаць працоўны дзень, мы мінулі чыгуначны пераезд на вуліцы Апанскага і ўзялі кірунак на Ракаў.

Шаша то выгінаецца між лясістых узгоркаў, то бяжыць сярод палеткаў даспяваючай збажыны. І вось дарога пайшла ўніз, бліснула невялічкая рачулка, абапал якой раскінуўся квяцісты луг. Яшчэ адзін пагорак, ізноў лагчына, і з-за кустоў паказалася купка касцоў у белых кашулях...

Мінаем Ракаў — гэтае тыповае старасвецкае мястэчка. У чысценькім Валожыне, што патануў у зеляніне дрэў, зварочваем на поўднёвы ўсход, туды, дзе відаць Ўкраіны славутай Налібоцкай пушчы.

Едзем гадзіну, другую, і ўспамінаюцца словы нашых падручнікаў па літаратуры: «Дунін-Марцінкевіч жыў у маёнтку Люцынка, **недалёка ад Мінска».** Паняцце «недалёка», відавочна, мае вельмі адвольны сэнс: спідометр нашай машыны паказваў ужо шосты дзесятак кілометраў. Радзіма Я. Купалы намнога бліжэй да сталіцы, але ні ў адным артыкуле не знойдзеш, каб было сказана, што Вязанка недалёка ад Мінска. Да Люцынкі, дзе жыў Дунін-Марцінкевіч, вельмі трывала прыстаў гэты вельмі няпэўны «арыенцір» — недалёка ад Мінска, і вандруе ён з кнігі ў кнігу. Мабыць, не ўсе ведаюць, што гэты шляхецкі засценак знаходзіцца ў Валожынскім раёне, у самым поўднёва-ўсходнім кутку яго, там, дзе нядаўна былі партызанскія сцежкі.

Ужо за вёскай Бабровічы адкрылася велічная панарама налібоцкіх бароў: на некалькі дзесяткаў кілометраў праглядаюцца масівы лясоў, якія на гарызонце зліваюцца ў бясконцую сінь. У далечы пушча пакрыта смугою, таму, здаецца, гэта не лес, а нейкія далёкія горы. Мінаем ціхія балотныя рачулкі са старымі вадзянымі млынамі, прыгожыя хутары ў засеі бяроз, луг, ад якіх духмяніць свежым сенам і краскамі.

Ля аднаго хутара, дзе некалькі чалавек прыладжвалі кроквы на новай калгаснай канюшні, спыняемся, каб распытаць дарогу ў Люцынку.

— Люцінку можа? — перапытвае пажылы вусаты дзядзька і паказвае рукою.—Вунь, дзе тая ліпа...

Тлумачым, што нас цікавіць месца, дзе жыў Дунін-Марцінкевіч — аўтар «Пінскай шляхты».

— Знаю, знаю, — кажа дзядзька і ўсміхаецца. — Колісь я нават Кручковым быў, як пастаноўкі ў нас рабілі...



На здымку: ліпа на сядзібе **В. Дуніна-Марцінкевіча.**

Дык вось ліпа тая якраз на сядзібе Дуніна-Марцінкевіча.

Спыняемся каля велічнага старога дрэва, якое ўсыпана скрозь кветкамі і здалёк здаецца жоўтым. Навокал стаіць духмяны ліповы пах, чуцён гул пчол, што сабраліся сюды, мабыць, з усяе ваколіцы. Пры самай ліпе падмурак і ганак, зарослыя крапівою і лебядою. Гэта ўсё, што засталося ад месца, дзе жыў паэт, які любіў сябе называць Наумам Прыгаворкам.

Калісьці тут, ля гэтай ліпы, стаяў невялічкі драўляны домік, у якім была каморка, дзе, схаваўшыся ад людскога вока, пісьменнік пісаў «Пінскую шляхту», «Залёты» і іншыя творы, якія хаваў у патайны кубелец.

Жылося Дуніну-Марцінкевічу ў гэтай глушы нялёгка: у 1857 годзе памерла жонка Юзэфа, у 1859 годзе быў канфіскаваны цэнзурай яго пераклад першых раздзелаў паэмы А. Міцкевіча «Пан Тадэуш», а ў пачатку 1863 года арыштавана дачка пісьменніка Марыя, якую потым улады выслалі «на жыхарства ў аддалёныя губерні» — у Сібір.

Пад нядрэмным паліцэйскім вокам пісьменнік не пакідаў сваёй грамадзянскай дзейнасці. Пазбаўлены магчымасці друкавацца і займацца аматарскімі тэатральнымі пастаноўкамі, ён не пакідаў літаратурнай працы. Ёсць звесткі, што «Пінская шляхта» і «Залёты» — толькі невялікая частка напісанага ў гэтыя цяжкія гады для Дуніна-Марцінкевіча. Жыў ён увесь гэты перыяд амаль без выезду ў Люцынцы. У Мінск не цягнула, бо былых сяброў там не было: хто памёр, хто быў далёка; паехаць у іншыя мясціны дазвалялі рэдка. Прыходзілася жыць на адзіноце. У доме, дзе калісь збіралася шумлівая кампанія сяброў, было ціха і спакойна. З суседзямі асаблівай дружбы не было, пісьменнік стаў домаседам, чытаў і пісаў у сваёй каморцы.

Кожны тыдзень наведваўся станавы прыстаў, нахабна тупаў па пакоях, заглядаў на кніжную паліцу, у пісьмовы стол, распытваў, ці прыязджаў хто, куды ездзіў пісьменнік.

Каб хутчэй закончыліся гэтыя «агледзіны» і распытванні, Дунін-Марцінкевіч клікаў дачку:

— Цэзарына, прынясі, калі ласка...

Дачка знала, што трэба, каб выправадзіць няпрошанага госця і на стале з'яўлялася пляшка гарэлкі і кусок вяндліны. Прыставу гэтага толькі і трэба было: ён адразу забываў пра службовыя абавязкі, апаражняў бутэльку, падкручваў вусы і праз тыдзень ізноў з'яўляўся па «дань». Начальству ён даносіў пра Дуніна-Марцінкевіча: «Паводзін добрых і скрытнага спосабу жыцця».

Пэўным разрыўкам з'яўлялася школка. Была зроблена нават спецыяльная прыбудоўка, дзе размяшчаўся клас, у якой вучылі грамаце вясковых дзяцей дочкі Цэзарына і Эладзя Прыходзіў сюды і пісьменнік, гутарыў з дзецьмі, чытаў казкі.

Жыхар з суседняй вёскі Мешаны Скрунць Віженцій, якому ўжо за 90 год і які памятае смерць і пахаванне пісьменніка, успамінае:

— Мой бацька хадзіў у Люцынку на заработкі і расказваў, што Марцінкевіч быў чалавек вельмі спагадлівы... Любіў слухаць песні... Бывала, прыдуць жанцы наймацца жаць, а ён пытае: «А песні спяваць умееце?»

Непадалёк ад Люцынкі, кілометраў тры-чатыры, у Тупальшчыне, на старасвецкім могільніку побач з магіламі сялян спачывае пясняр. За агароджай, складзенай з вялікіх каменняў, пад хвоямі між кустоў бэзу магіла Дуніна-Марцінкевіча. На магіле вялікі заросшы мохам крыж, просценькі надпіс, сціплая драўляная агарожа, зробленая вучнямі суседняй школы...

У некралогу «Беларускі пясняр» польскі часопіс «Край» пісаў пра В. Дуніна-Марцінкевіча: «З удзячнасцю і сардэчнасцю ўспомняць яго некалі, як вырастуць, беларускія патомкі». Гэты час прышоў. Зярняты, кінутыя Дуніным-Марцінкевічам больш ста гадоў таму назад, не прапалі дарма. Недалёка ад Саборнай плошчы ў Мінску (зараз плошча Свабоды), дзе адбылася ўпершыню пастаноўка оперы «Сялянка», узвышаецца цяпер Беларускі тэатр оперы і балету. На кніжнай паліцы побач са сціплымі кніжкамі «Вечарніцы», «Гапон», «Пінская шляхта» сталі тамы Я. Купалы і Я. Коласа, якія на ўвесь голас сказалі праўду пра жыццё беларускага селяніна.

С. АЛЕКСАНДРОВІЧ.

Галоўны рэдактар Мікола ТКАЧОЎ.
Рэдакцыйная калегія: Заір АЗГУР, Аляксандр БУТАКОЎ, Кастусь ГУБАРЭВІЧ, Васіль ІВАШЫН, Аркадзь МАРЦІНОВІЧ (адказны сакратар), Пятро ПРЫХОДЗЬКА, Раман САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), Янка ШАРАХОЎСКІ, Іван ШАДІЛА, Рыгор ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць два разы на тыдзень: у сераду і суботу.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, аддзела літаратуры—3-22-04, аддзела мастацтва—3-24-62, аддзела культуры—3-21-53.

АТ 09483 Друкарня імя Сталіна